Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 МАЯ 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 95 (25960)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Падпіска-2007

**СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ**

**Пачалася падпіска на 3-і квартал і ІІ паўгоддзе 2007 года.**

**ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (У РУБЛЯХ, УСТАНОЎЛЕНЫ З 01.07.2007 Г.)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8200 | 24600 | 49200 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 7850 | 23550 | 47100 |
| 63858 (ведамасны) | 13000 | 39000 | 78000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 11850 | 35550 | 71100 |

**Спадзяёмся на вашу падтрымку, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.**

## Кіпрская кампанія «СБ-Тэлекам» зацікаўлена ў інвеставанні ў беларускія цэментныя заводы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 мая сустрэўся са старшынёй праўлення кіпрскай кампаніі «СБ-Тэлекам» Ідам Самаві.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў інвестару за дабрачынную дзейнасць кампаніі ў Беларусі. «Для Беларусі цяжка знайсці чалавека, які займаўся б дабрачыннасцю ў краіне ў такім аб'ёме», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што гэтыя сродкі былі накіраваныя, у асноўным, на медыцынскія мэты, развіццё аховы здароўя і рэканструкцыю бальніц.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: «У нас няма ніякай прадузятасці адносна вашай дзейнасці. Наадварот, я вам давяраю і гатовы разгледзець прапановы па развіццю вашага бізнесу ў Беларусі».

У той жа час Ід Самаві запэўніў Аляксандра Лукашэнку, што дзейнасць кампаніі «СБ-Тэлекам» у Беларусі будзе ажыццяўляцца адкрыта і празрыста.

Кіпрская кампанія «СБ-Тэлекам» мае намер удзельнічаць у будаўніцтве першакласнай гасцініцы ў Мінску. Акрамя гэтага, гэта кампанія зацікаўлена ў інвеставанні сродкаў у рэканструкцыю і пераўзбраенне беларускіх цэментных заводаў. У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся і іншыя сумесныя інвестыцыйныя праекты.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ВЫЗВАЛЕНЫЯ Ў ВЫНІКУ АДМЕНЫ ШЭРАГУ ЛЬГОТ СРОДКІ ПОЙДУЦЬ НА АДРАСНУЮ САЦЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргей Забалоцкі, каментуючы журналістам прыняты 23 мая парламентам законапраект аб льготах.

Паводле яго слоў, гэты законапраект знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў больш як 3,5 года, дакумент «вельмі складана нараджаўся, але дэпутаты арыентаваны на адно: гэта вымушаная мера нашай дзяржавы». Сяргей Забалоцкі адзначыў, што калі 10 гадоў таму чацвёра працуючых «утрымлівалі» аднаго пенсіянера, то сёння працоўныя рэсурсы пастарэлі, гэты паказчык складае 1,4 чалавека. Дзве трэці насельніцтва з'яўляюцца льготнікамі — гэта не пад сілу ні адной эканоміцы.

## ПАВЫШЭННЕ МЫТНЫХ ПОШЛІН — НЯЗНАЧНАЕ

Дзяржаўны мытны камітэт не плануе значнага павышэння мытных пошлін на ўвозімыя аўтамабілі, паведаміў намеснік старшыні ДМК Леанід ДОСАЎ.

Паводле яго слоў, Дзяржаўны мытны камітэт выступае за павышэнне аўтамабільных пошлін на 5 еўрацэнтаў за 1 куб.см аб'ёму рухавіка. Як раней паведамлялася, ДМК Беларусі прапаноўвае павысіць увазныя мытныя пошліны на аўтамабілі з 1 ліпеня і не дыферэнцыраваць іх павышэнне ў залежнасці ад года выпуску аўтамабіля, аб'ёму рухавіка і іншых характарыстык.

**БЕЛТА.**

**Вітольд ПЕСЦІС, старшыня Гродзенскага абласнога грамадскага аб'яднання "Белая Русь":**

# "НОВЫЯ ЗАДАЧЫ НА ШЛЯХУ ДА МОЦНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ ПАТРАБУЮЦЬ ЗГУРТАВАНАСЦІ ЎСЯГО НАРОДА"

**Як паведамляла ўжо «Звязда», на пашыраным пасяджэнні прэзідыума Гродзенскага абласнога грамадскага аб'яднання «Белая Русь» прыняты зварот да грамадзян Беларусі з заклікам падтрымаць яго ініцыятыву і паўсюдна стварыць рэгіянальныя грамадскія аб'яднанні «Белая Русь» у падтрымку курсу, які праводзіцца кіраўніком дзяржавы.**

**Сёння больш падрабязна аб гэтай арганізацыі расказвае яе старшыня, рэктар Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Вітольд Песціс.**

***— Вітольд Казіміравіч, на пачатку нашай гутаркі паспрабуйце, калі ласка, літаральна ў некалькіх сказах акрэсліць мэту грамадскага аб'яднання «Белая Русь»:***

— Сёння няма неабходнасці каго-небудзь пераконваць у тым, што наша маладая суверэнная дзяржава знаходзіцца на пад'ёме ва ўсіх сферах жыцця. Аднак тое, што мы маем сёння — гэта толькі пачатак вялікага шляху да моцнай і незалежнай Беларусі. Створаны фундамент для новага этапу развіцця рэспублікі, дзе на першае месца выходзяць высокія паказчыкі якасці жыцця народа і забеспячэнне дастойнага месца нашай краіны ў сусветнай эканоміцы. Новыя задачы патрабуюць згуртаванасці ўсяго народа, яднання яго сіл, каб агульнымі намаганнямі пазбавіцца ад існуючых праблем і недахопаў. Рэзервы для вырашэння гэтых задач ёсць. Адсюль і намер нашай арганізацыі: стаць надзейнай апорай кіраўніка дзяржавы, органаў улады ў ажыццяўленні праграмных накірункаў развіцця краіны.

***— А цяпер звернемся да канкрэтыкі. Калі не памыляюся, то два з паловай гады таму ў першай установчай канферэнцыі «Белай Русі» ўдзельнічалі 500 чалавек...***

— Так. А сёння ў складзе нашай арганізацыі больш за 12 тысяч чалавек, якія аб'яднаны ў амаль 800 пярвічных арганізацый ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны. Гэта работнікі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, навукі, адукацыі, культуры, аховы здароўя — ад вучонага, кіраўніка прадпрыемства да простага рабочага, селяніна, сем членаў Савета Рэспублікі, пяць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, два Героі Рэспублікі Беларусь.

***— «Белая Русь», як правіла, выказвае сваю пазіцыю падчас выбараў усіх узроўняў улады і іншых важных дзяржаўных кампаній. А чым яшчэ вызначаецца роля аб'яднання ў грамадскім жыцці вобласці і рэспублікі?***

— Мы не проста выказваемся па важнейшых пытаннях жыцця краіны, але і актыўна ўдзельнічаем ва ўсіх агульнадзяржаўных мерапрыемствах, у тых жа выбарах дэпутатаў. Больш за дзевяць тысяч нашых прадстаўнікоў на нядаўна прайшоўшых выбарах у мясцовыя Саветы працавалі ў складзе выбарчых камісій, ініцыятыўных і агітацыйных груп. 765 членаў «Белай Русі» сталі дэпутатамі ўсіх узроўняў мясцовых Саветаў. Цяпер у абласным, гарадскім, раённых, пасялковых і сельскіх Саветах Гродзеншчыны каля паловы, а ў некаторых раёнах больш за пяцьдзесят працэнтаў — прадстаўнікі нашай арганізацыі. Значыць, людзі нам давяраюць і гэты давер трэба апраўдваць. Выбранне значнай колькасці членаў «Белай Русі» дэпутатамі мясцовых Саветаў — не самамэта, а рэальная магчымасць быць бліжэй да людзей, іх інтарэсаў і праблем.

Наша аб'яднанне ўжо мае вопыт удзелу ў растлумачэнні сярод насельніцтва ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, працідзеяння дэструктыўнай апазіцыі, уваходзіць у сістэму дыскусіі па важнейшых праблемах жыцця краіны на пасяджэннях «круглага стала». Члены абласнога прэзідыума «Белай Русі» і актывісты раённых арганізацый удзельнічаюць у правядзенні адзіных палітдзён.

Вялікую ўвагу наша аб'яднанне надае патрыятычнаму выхаванню моладзі, падтрымцы ўдзельнікаў вайны. У большасці раёнаў «Белая Русь» прыняла на сябе клопат аб помніках абаронцам Радзімы, магілах загінулых воінаў. Мастоўская раённая арганізацыя па сваёй ініцыятыве і за сродкі «Белай Русі» паклапацілася аб перапахаванні і ўстанаўленні помніка савецкім лётчыкам, якія загінулі ў вайну на тэрыторыі раёна. Гэту работу мы будзем працягваць. Разам з нашым народам нікому не дазволім адняць у нас Перамогу і перагледзець вынікі Вялікай Айчыннай вайны.

Яшчэ адзін прыярытэтны накірунак дзейнасці нашай арганізацыі — рэальны ўдзел у прэзідэнцкай праграме «Дзеці Беларусі». Па рашэнню савета «Белай Русі» мы спланавалі гэту работу і прыступілі да яе рэалізацыі. Абласное аб'яднанне ў парадку дабрачыннасці аказала матэрыяльную падтрымку Лойкаўскаму дзіцячаму прытулку і рэабілітацыйнаму цэнтру дзіцячых захворванняў. На чарзе — дапамога іншым дзіцячым установам.

Шматтысячны атрад «Белай Русі» здольны (і ён гэта робіць) аказваць свой станоўчы ўплыў перш за ўсё ў працоўных калектывах. Гэта і асабісты прыклад членаў аб'яднання ў працы, і падтрымка кіраўнікоў вытворчасці ў пошуку і ўкараненні перадавых метадаў работы, і мабілізацыя людзей на беражлівыя адносіны да матэрыяльных рэсурсаў, і непрымірымая барацьба з безгаспадарнасцю, нізкай якасцю выраблямай прадукцыі, п'янствам. Трэба растлумачваць людзям, што і чаму адбылося ва ўзаемаадносінах з Расіяй — разумна, не дапускаючы і ценю сумненняў у брацкай дружбе і адзінстве паміж нашымі народамі.

***— Як узнікла ідэя выхаду грамадскага аб'яднання «Белая Русь» на рэспубліканскі ўзровень?***

— У сваёй вобласці мы стварылі моцную грамадскую арганізацыю і за два з паловай гады пераканаліся ў апраўданасці нашай ініцыятывы. Аб'яднанне вырасла колькасна, умацавалася структурна, знайшло сваю нішу ў грамадскім жыцці рэгіёна і сваёй актыўнасцю набыло пэўны аўтарытэт сярод насельніцтва, мае падтрымку органаў мясцовай улады. Пры гэтым становіцца ўсё больш відавочна, што статутныя мэты і задачы нашай арганізацыі выходзяць за рамкі адной вобласці і носяць рэспубліканскі характар. У ходзе нядаўніх справаздач і выбараў у нашых раённых і пярвічных арганізацыях закранапася пытанне аб перспектывах стварэння на платформе абласной арганізацыі адзінага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

***— На ваш погляд, ці можа грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» у перспектыве стаць партыяй?***

— Кіраўнік дзяржавы ў шэрагу выступленняў падкрэсліваў, што падтрымае тую партыю, якая будзе створана не па ўказцы зверху, а па ініцыятыве знізу. Пры ўмове, што такая партыя будзе дзейнічаць на карысць народа, у інтарэсах умацавання дзяржавы і працвітання краіны. Аднак стварэнне яе павінна ісці знізу, ад народа, без ціску зверху. І гэта правільна, наша аб'яднанне так і стваралася, з такімі ж мэтамі і задачамі дзейнічае. Праўда, казаць аб «партыйнай» перспектыве «Белай Русі», на маю думку, пакуль заўчасна, на парадку дня — стварэнне адзінага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання. З адпаведнай прапановай мы звярнуліся да грамадзян Беларусі і разлічваем на падтрымку ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны.

Наша яднанне на рэспубліканскім узроўні, шырокае далучэнне грамадзян у грамадскія працэсы паслужыць дзяржаве ў вырашэнні галоўнай задачы — зрабіць краіну моцнай і квітнеючай, паскорыць правядзенне ў жыццё асноўных накірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі, якія былі абазначаны на Трэцім Усебеларускім народным сходзе і ў праграмных дакументах парламента і ўрада.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**





Фота БЕЛТА.

## УРАД БЕЛАРУСІ ЎСТАНАВІЎ ПАМЕРЫ ПЛАТЫ ЗА НАВУЧАННЕ КІРАВАННЮ ТРАНСПАРТНЫМІ СРОДКАМІ

Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 616.

Такім чынам, цяпер плата (гранічны максімальны тарыф) за навучанне кіраванню транспартным сродкам для падрыхтоўкі або перападрыхтоўкі вадзіцеляў катэгорыі А складзе Br222,74 тыс., катэгорыі В — Br599,08 тыс., катэгорыі С — Br1 млн 86,1 тыс., катэгорыі В-С — Br1 млн 232,02 тыс.

У плату не ўключаны расходы на аўтамабільнае паліва, што выкарыстоўваецца пры навучанні кіраванню механічным транспартным сродкам. Парадак аплаты і ўлік гэтых расходаў зацвярджаюцца Міністэрствам транспарту і камунікацый. Плата за навучанне ўстаноўлена з улікам падатку на дабаўленую вартасць.

**БЕЛТА.**

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 мая 2007 года ў 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Абітурыент-2007

## Назіраць за конкурсам можна будзе ў Інтэрнэце

12 чэрвеня ў Беларусі афіцыйна стартуе прыёмная кампанія — у гэты дзень абітурыенты вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў будуць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове. Паводле слоў галоўнага інспектара ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі Марыі Карпенка, у адрозненне ад папярэдніх гадоў сёлета падрыхтоўка да прыёмнай кампаніі праходзіць даволі спакойна. Аб гэтым можна меркаваць і па колькасці званкоў, што паступаюць на «гарачую» лінію «Абітурыент-2007», якая пачала працаваць у Міністэрстве адукацыі 15 мая: 40 званкоў супраць 300 мінулагодніх за аналагічны перыяд.

Усяго ў дзяржаўныя ВНУ плануецца прыняць сёлета 75,3 тысячы чалавек, у тым ліку 42,5 тысячы чалавек — на дзённую і 32,8 тысячы — на завочную форму навучання. 30,8 тысячы маладых людзей будуць прынятыя ў дзяржаўныя ВНУ на бюджэт, з іх 23 тысячы — на дзённае навучанне. Прыватныя ВНУ плануюць залічыць на першы курс каля 8 тысяч чалавек. Сярод новых спецыяльнасцяў, на якія будзе ажыццяўляцца набор, варта адзначыць спецыяльнасці «Архітэктурны дызайн» у БНТУ і «эканоміка і кіраванне турыстычнай індустрыяй» у БДЭУ. Некалькі новых, актуальных для сучаснага рынку працы спецыялізацый, з'явіцца таксама на эканамічных спецыяльнасцях. А вось сам план набору на эканамічныя спецыяльнасці будзе скарочаны на 18 працэнтаў, на юрыдычныя спецыяльнасці — на 15 працэнтаў і на асобныя педагагічныя спецыяльнасці — на 25 працэнтаў.

Абапіраючыся на вопыт мінулагодняй прыёмнай кампаніі, Марыя Карпенка звярнула ўвагу абітурыентаў на наступную акалічнасць: падача дакументаў у ВНУ другога патоку і на бюджэтную, і на платную форму навучання завяршаецца 29 ліпеня, і далейшае перасоўванне дакументаў дапускаецца толькі для асобаў, якія не прайшлі па конкурсу на бюджэтныя месцы. Ім прадастаўляецца права быць залічанымі на платную форму навучання або паспрабаваць са сваімі дакументамі паступіць у прыватную навучальную ўстанову пры ўмове супадзення ўступных іспытаў. Нават тыя маладыя людзі, якія першапачаткова зарыентаваныя на платнае навучанне, усё роўна павінны падаць свае дакументы ў прыёмную камісію да 29 ліпеня і ўдзельнічаць у агульным конкурсе. Толькі ў гэтым выпадку ім будзе выдадзена даведка з пацвярджэннем, што яны ўдзельнічалі ў агульным конкурсе, з якой яны змогуць звярнуцца ў іншую ВНУ.

Магчыма, сёлета зрабіць высновы аб тым, ёсць у цябе шанцы прайсці па конкурсу ці няма, будзе значна прасцей. Па-першае, 43 з 53 вышэйшых навучальных устаноў будуць ажыццяўляць залічэнне па выніках трох сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання (летась іх было ўдвая менш). Такім чынам не прыйдзецца чакаць вынікаў здачы ўнутрывузаўскага іспыту. Па-другое, Міністэрствам адукацыі была распрацаваная адзіная для ўсіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў форма прадастаўлення інфармацыі аб ходзе прыёму дакументаў. Прыёмныя камісіі абавязаны інфармаваць абітурыентаў на сайтах навучальных устаноў у Інтэрнэце, на папяровых носьбітах на спецыяльных стэндах, а таксама, калі ёсць такая магчымасць — і на электронных табло, і абнаўляць гэту інфармацыю не радзей, чым адзін раз у тры гадзіны. Можна, зразумела, і часцей. Тры гадзіны — гэта максімальны тэрмін. Паколькі прыёмныя камісіі будуць працаваць з 9 гадзін раніцы да 18 гадзін без перапынку на абед, то самая «свежая» інфармацыя павінна з'яўляцца ў 9, 12, 15 і 18 гадзін.

Яшчэ адно новаўвядзенне будучай прыёмнай кампаніі датычыцца пераводу стобальнай тэставай шкалы ў дзесяцібальную сістэму ацэнкі. З улікам прапаноў членаў дзяржаўнай камісіі па кантролю за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў, сёлета атрыманыя абітурыентам балы будуць аўтаматычна дзяліцца на 10. Напрыклад, абітурыент набраў на тэсціраванні 85 тэставых балаў — па дзесяцібальнай шкале гэта будзе 8,5 бала, 94 балы — 9,4 бала і гэтак далей. Мінімальны прахадны тэставы бал па ўсіх дысцыплінах — 15 балаў. У вышэйшых навучальных установах, якія не праводзяць уласных уступных іспытаў, залічэнне будзе весціся па 100-бальнай сістэме.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Тэлефон «гарачай» лініі «Абітурыент-2007» у Міністэрстве адукацыі (8-017) 200-84-70**
**Працуе з 15 мая па 31 жніўня.**

Здарэнне

## «АЎТАДЗІРКА»



**23 мая па вуліцы Кастрычніцкай на мосце цераз раку Свіслач пад вагой рамонтнага аўтамабіля Мінгарсвятла правалілася тратуарная пліта. Ніхто ў аварыі не пацярпеў.**

Аўтавышка павінна была праехаць па тратуару для пешаходаў, але пад яе заднім колам праваліўся асфальт. Машыну давялося выцягваць пры дапамозе тросаў і кранаў тэхнічнай дапамогі. Прадстаўнік КУП «Гармост» Віталь Каперын запэўніў, што мост не знаходзіцца ў аварыйным стане. Ён з'яўляецца бяспечным для пешаходаў, аднак шматтонную вагу рамонтнай машыны ўжо не вытрымае. У хуткім часе па плану тут павінны быць заменены тратуарныя пліты.

Усе рамонтныя работы на мастах павінны праводзіцца з дазволу «Гармоста», аднак у гэтым выпадку такое правіла выканана не было.

**Анастасія КАРАЦЕЕВА. Фота аўтара.**

Прамая лінія

# СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

**На пытанні «прамой лініі» адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ.**

***(Працяг. Пачатак у нумарах за 23, 24 мая.)***

**☎ — Ці патрэбна плаціць за наведванне дзіцячага садка дзіцем-інвалідам? І якія ўвогуле ёсць ільготы для такіх дзяцей?**

**Ірына ПАНЧЫШЫНА,** *г. Гомель*

— Дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця сапраўды могуць вызваляцца ад аплаты за наведванне дашкольных устаноў усіх тыпаў. Аднак падрабязней наконт гэтага ўсё ж лепш пацікавіцца ў аддзеле адукацыі па месцы жыхарства.

А зараз аб ільготах і гарантыях сем'ям, што выхоўваюць дзіця-інваліда. Па-першае, дапамогі на такіх дзяцей як да трох, так і пасля трох гадоў прызначаюцца з 40-працэнтнай надбаўкай. Пры гэтым дапамога на дзіця-інваліда ва ўзросце звыш 3 гадоў прадастаўляецца без уліку сукупнага даходу сям'і, і да таго ж да моманту, пакуль гэтаму дзіцяці не споўніцца 18 гадоў.

Па-другое, калі маці, бацька або іншы сваяк аформіў догляд дзіцяінваліда ў органах па працы і сацыяльнай абароне, то ім выплачваецца штомесячная дапамога ў памеры 65 працэнтаў ад «сярэдняга» бюджэту пражытковага мінімуму. Па-трэцяе, у дадатак да ўзгаданых дапамог, на дзіця-інваліда прызначаецца пенсія, памер якой залежыць ад ступені страты здароўя. Так, пры першай ступені страты здароўя пенсія складае 150, другой ступені — 175, трэцяй ступені — 200, а чацвёртай — 200 працэнтаў ад мінімальнай пенсіі па ўзросту.

Па-чацвёртае, дзеці-інваліды маюць права на атрыманне адзін раз у год пуцёўкі на аздараўленне. Прычым на ўвесь час іх санаторна-курортнага лячэння (з улікам часу на праезд) на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі аб неабходнасці індывідуальнага догляду аднаму з працуючых бацькоў, апекуну ці папячыцелю, у сям'і якіх выхоўваецца дзіця-інвалід, выплачваецца дапамога ў памеры 100 працэнтаў сярэдняга заробку.

Далей. Паводле Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў (або інвалідаў з дзяцінства) на працягу не менш за 8 гадоў да іх паўналецця і маюць не менш чым 20-гадовы працоўны стаж, могуць выходзіць на пенсію раней — у 50-гадовым узросце. Таксама раней (у 55-гадовым узросце) у некаторых выпадках можа выходзіць на пенсію і бацька. Аднак для гэтага неабходныя ўмовы — не менш чым 8-гадовы перыяд выхавання дзіцяінваліда да паўналецця, наяўнасць не менш чым 25-гадовага працоўнага стажу, а таксама адмова маці дзіця-інваліда скарыстацца правам на датэрміновую пенсію на карысць бацькі ці немагчымасць скарыстацца маці такім правам з прычыны яе смерці.

Нарэшце, колькі слоў аб працоўных гарантыях. Наш Працоўны кодэкс вызначае, што пры складанні графікаў водпускаў наймальнік абавязаны запланаваць водпуск маці дзіця-інваліда ў летні або іншы зручны для яе час. І яшчэ. Паводле артыкула 265 Кодэкса, маці, якая выхоўвае дзіця-інваліда, па яе заяве прадастаўлецца адзін свабодны ад работы дзень у месяц з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання, а таксама адзін свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку за кошт сродкаў наймальніка.

**☎ — Ці праўда, што ў хуткім часе магчымасць атрымліваць свабодны працоўны дзень у тыдзень зможа або маці, або бацька дзіця-інваліда?**

**Алена Станіславаўна,** *Валожынскі раён*

— Сапраўды, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ужо разгледзелі ў першым чытанні некаторыя змяненні ў Працоўны кодэкс, якімі ў прыватнасці прадугледжана, што адзін свабодны ад работы дзень у тыдзень, права на які зараз мае толькі маці дзіця-інваліда, будзе прадастаўляцца аднаму з працуючых бацькоў. Такім чынам, застаецца дачакацца другога чытання і прыняцця гэтага закона.

***(Заканчэнне будзе.)***

**Сяргей ГРЫБ.**

Крымінал

## КВАТЭРА НА СУТКІ

**Ахвярамі зладзеяў станавіліся гаспадары шыкоўных сталічных кватэр, якія здавалі жыллё на суткі**

У Мінску супрацоўнікі крымінальнага вышуку Савецкага РУУС ноччу затрымалі крымінальнае «трыо», удзельнікі якога спецыялізаваліся, як мяркуецца, на крадзяжах мэблі, сантэхнікі і іншага дабра.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, у сталіцы было зарэгістравана некалькі фактаў, калі невядомыя ў розных раёнах горада здымалі на суткі жыллё, а раніцай прадпрымальныя гаспадары, завітаўшы дадому, натыкаліся літаральна на пустыя сцены. Часам «сутачнікі» не грэбавалі нават зрываць плінтусы ў кватэрах, бывала, што выкручвалі і лямпачкі. У адной з кватэр на праспекце Незалежнасці пасля візіту зладзеяў знікла джакузі. А выйшлі на злачынцаў праваахоўнікі ў ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў: у міліцыю паступіла інфармацыя аб тым, што на вуліцы Куйбышава трое падазроных асобаў знялі кватэру. Узялі прайдзісветаў «цёпленькімі», якраз калі яны пакавалі рэчы. Затрыманыя аказаліся жыхарамі Віцебскай, Гродзенскай і Маскоўскай абласцей. Зараз устанаўліваецца, ці маюць злачынцы дачыненне да 6 аналагічных крымінальных эпізодаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## УХІЛІСТ «ЗЭКАНОМІЎ» 488 МІЛЬЁНАЎ

**Каля сямі месяцаў займаўся аўтамабільным бізнэсам дзялок са Смаргоні, пазбягаючы платы мытных плацяжоў.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, у 2005 годзе гэта прадпрымальная асоба разам з «аднадумцамі» ўвозіла ў краіну аўтамабілі, якія потым рэалізоўваліся. А вось ад платы мытных плацяжоў прайдзісветы ўсяляк ухіляўся, «зэканоміўшы» такім чынам 488,7 мільёна рублёў. Зараз Смаргонскім міжрайаддзелам Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці ў адносінах да падазронага ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ТРАГЕДЫЯ НА ШАХЦЕ «ЮБІЛЕЙНАЯ»

**38 шахцёраў загінулі ў выніку выбуху метану на шахце «Юбілейная» ў Кемераўскай вобласці. Паранены 7 чалавек, адзін пацярпелы шпіталізаваны ў рэанімацыю гарадской бальніцы. Непасрэдна ў эпіцэнтры выбуху працавалі 39 гарнякоў, з іх выжыць удалося толькі аднаму.**

Тым часам расійскія інфармагенцтвы ўчора паведамілі сенсацыйную навіну: у пятніцу, 25 мая, абсталяванне шахты павінны былі правяраць, а кіраўніцтву было вядома, што ўжо тыдзень ў лаве павышанае ўтрыманне метану. Відавочцы сцвярджаюць, што на працягу 2-х апошніх тыдняў пастаянна спыняўся вугальны канвеер для падняцця пароды. Гэта магло адбывацца толькі пры аўтаматычным спрацоўванні сістэмы блакіравання газа-сістэмнага абсталявання.

***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку аварыі.***

### ЗНАЙШОЎ СВОЙ КАШАЛЁК ПРАЗ 37 ГАДОЎ

Амерыканец Джон Мітчэл атрымаў назад свой кашалёк, які ён згубіў 37 гадоў таму. З кашалька нічога не прапала. Кашалёк знайшлі пры рамонце будынка кафэ, седзячы ў якім Мітчэл у 1970 годзе і згубіў кашалёк.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

АСБ «Беларусбанк» информирует,

**что с 28 мая 2007 года начинает прием денежных средств на новый срочный банковский вклад в белорусских рублях**

**«ЮБИЛЯР».**

Срок хранения вклада — 30 месяцев, но с возможностью совершения расходной операции по истечении одного месяца со дня открытия вклада без пересчета дохода по пониженной процентной ставке.

Минимальная сумма вклада – 100 000 белорусских рублей.

По вкладу выплачивается основной и дополнительный доход в виде процентов.

Основной доход по вкладу начисляется в размере ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс два процентных пункта.

Проценты присоединяются к остатку вклада по истечении каждого месяца хранения.

При несовершении расходной операции по вкладу до дня наступления срока его возврата, на фактический остаток вклада начисляется дополнительный доход в размере одного процента годовых.

Вклад может быть открыт на имя другого лица и пополняться в течение всего срока хранения.

Предлагаем также воспользоваться и другими услугами, имеющимися в банке.

Будем рады видеть Вас клиентами АСБ «Беларусбанк».

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка

http://www.belarus-bank.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.05.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 2 881,38 |
| 1 латвійскі лат | 4 138,53 |
| 1 літоўскі літ | 834,27 |
| 1 чэшская крона | 102,01 |
| 1 польскі злоты | 759,20 |
| 1 расійскі рубель | 82,82 |
| 1 украінская грыўня | 426,14 |

*Курсы замежных валют для беназаўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,9002 |
| 10 UAH | 51,3985 |
| 1000 BYR | 12,0424 |
| EUR | 34,8358 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 24.05.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Крыён»

# «КРЫЁН» СКІРАВАНЫ Ў БУДУЧЫНЮ



**По сутнасці, на ўсіх прадпрыемствах краіны адчулі новыя цэны на энергарэсурсы. Ці адчулі іх на добра вядомым мінскім прадпрыемстве «Крыён»?**

**— Ну вядома, — адзначаюць тут. — У сабекошце нашай прадукцыі каля 60 працэнтаў складаюць выдаткі на электраэнергію, а яе кошт, як вядома, павысіўся на 21 працэнт. Пры нашым маштабным электраспажыванні (а спажываюць тут каля 7,5 мільёна кілават-гадзін у месяц) набягае вельмі істотная дадатковая сума. Прычым рост кошту энергарэсурсаў, а ў тым ліку і электраэнергіі, чакаецца і ў далейшым...**

**На «Крыёне», аднак, не застаюцца ў ролі простых назіральнікаў за ўсім гэтым рухам цэн. Тут, па сутнасці, яшчэ год таму распачалі маштабную падрыхтоўку да цяперашняга павышэння цэн на энергарэсурсы. Сутнасць гэтай падрыхтоўкі — рэканструкцыя. Дарэчы, рэканструкцыямі цяпер мала каго здзівіш — яны рэгулярна праводзяцца на многіх прадпрыемствах, яны неаднойчы праводзіліся да гэтага і на «Крыёне». Цяперашняя, аднак, выбіваецца з гэтага шэрагу — яна параўнальная з узвядзеннем новага такога ж прадпрыемства, і нават больш магутнага па прадукцыйнасці. На «Крыёне» так і адзначаюць: гэта будзе зусім новы завод, прычым ён будзе мець зусім іншы тэхналагічны ўзровень.**

**Аднак пра рэканструкцыю і яе асаблівасці, пра тое, што яна з сабой нясе, крыху ніжэй. А спачатку нагадаем, што сабой уяўляе «Крыён».**

Гэта адзінае ў рэспубліцы прадпрыемства, якое спецыялізуецца на выпуску так званых прадуктаў раздзялення паветра. Што ўваходзіць у пералік гэтых прадуктаў? Кісларод вадкі і газападобны, тэхнічны і медыцынскі; азот вадкі і газападобны, тэхнічны і павышанай чысціні; аргон вадкі і газападобны. Гэтыя прадукты атрымліваюць на «Крыёне» метадам нізкатэмпературнай рэктыфікацыі, ля вытокаў якой у свой час стаяў вядомы акадэмік Капіца. Нізкатэмпературная рэктыфікацыя прыводзіць да паэтапнага выпадання з паветра, якое запампоўваецца на «Крыёне» магутнымі кампрэсарамі ў спецыяльныя ўстаноўкі і сціскаецца ў іх да 200 атмасфер, — кіслароду, аргону і азоту пры тэмпературах мінус 183, мінус 185 і мінус 196 градусаў адпаведна.

Дзе выкарыстоўваюцца прадукты «Крыёна»? У самых розных сферах народнай гаспадаркі — у металургіі, медыцыне, хімічнай прамысловасці, атамнай энергетыцы і г.д., яны прымяняюцца для ахалоджвання лазераў, пры аўтагенна-зварачных работах, для стварэння абароннага інертнага асяроддзя падчас апрацоўкі крышталяў — будучай асновы мікрасхем у радыёэлектроніцы... «За год на «Крыёне» вырабляюць каля 40 тысяч тон вадкага кіслароду — такая яго цяперашняя магутнасць. Свае прадукты «Крыён» адпраўляе як чыгуначным, так і аўтамабільным транспартам, пры гэтым мае свой адпаведны немалы парк. Частка прадуктаў «Крыёна» паступае на такія буйныя мінскія прадпрыемствы, як «Інтэграл», МАЗ, НДІ радыёматэрыялаў, па трубаправодах. Дастаўка спажыўцам газападобных прадуктаў робіцца ў 40-літровых балонах.

«Крыён» поўнасцю задавальняе патрэбы народнай гаспадаркі краіны ў сваіх прадуктах. Так, за апошнія гады на ўнутраны рынак краіны, як з гонарам падкрэсліваюць тут, не паступіла ніводнага балона з кіслародам звонку. Разам з тым каля паловы сваіх прадуктаў раздзялення паветра «Крыён» экспартуе. Прадпрыемства выкарыстоўвае свае цяперашнія магутнасці, з улікам бесперапыннага тут рэжыму работы, практычна поўнасцю на 100 працэнтаў, што, дарэчы, з'явілася дадатковым стымулам да той жа рэканструкцыі. А найгалоўнейшы стымул — ужо зразумелы: энергазберажэнне. Дарэчы, мэты рэканструкцыі на «Крыёне абазначаюць больш шырока: гэта клопат пра будучыню, перспектыву, пра павышэнне канкурэнтаздольнасці яго прадукцыі і яшчэ большае ўмацаванне пазіцый на знешніх рынках збыту.

◆ ◆ ◆

Такім чынам, маштабная рэканструкцыя. Што яна мае на ўвазе? Вось што расказаў начальнік тэхнічнага аддзела Міхаіл Філіпаў. Цяпер на «Крыёне» дзейнічаюць тры ўстаноўкі па атрыманню прадуктаў паветра, іх сумарная магутнасць — 3,5—3,6 тысячы тон кіслароду ў месяц. Магутнасць новай устаноўкі, якая з'явіцца ў выніку гэтай



рэканструкцыі, — каля 5 тысяч тон кіслароду ў месяц. Такім чынам, яна будзе здольна перакрыць цяперашнія тры, якія пасля яе задзейнічання будуць паступова выведзены з эксплуатацыі. За кошт павелічэння аб'ёмаў, прадукцыйнасці ў асноўным і чакаецца зніжэнне ўдзельнай вагі электраэнергіі ў сабекошце прадукцыі. Як адзначаюць на «Крыёне», доля электраэнергіі ў сабекошце гэтай прадукцыі павінна апусціцца да 40 працэнтаў (цяпер, нагадаем, на прадпрыемстве маюць каля 60 працэнтаў),

Гэта — не адзінае, што нясе з сабой рэканструкцыя. Новае абсталяванне забяспечыць і больш высокую экалагічную чысціню вытворчасці. Цяпер у тэхналогіі прадпрыемства задзейнічаны кампрэсары, для забеспячэння працы якіх выкарыстоўваецца масла. Апошняе, пасля адпаведнага тэхналагічнага цыкла, пераўтвараецца ў водна-масляную эмульсію, якая дастаўляе пэўныя праблемы па яе ўтылізацыі. Гэтыя праблемы амаль цалкам выключае новая тэхналогія. І яшчэ: цяпер у вытворчым цыкле задзейнічана старое абсталяванне, на якім папярэдняя ачыстка паветра (а такая ачыстка — абавязковая) ажыццяўляецца хімічным метадам з дапамогай каўстычнай соды. Новая ж тэхналогія прапаноўвае так званыя малекулярныя сіты, што таксама значна павышае экалагічнасць усяго працэсу.

Новая тэхналогія, «новы завод», пра што ўжо зазначалася, нясуць з сабой у цэлым зусім іншы ўзровень вытворчасці. Як падкрэслівае начальнік тэхнічнага аддзела «Крыёна» Міхаіл Філіпаў, гэта абсталяванне — новага, сучаснага пакалення, кіраванне ўсім працэсам на ім будзе цалкам камп'ютарызавана. Адпаведна, асобныя, больш высокія патрабаванні будуць прад'яўлены і да абслуговага персаналу. Пры гэтым варта адзначыць: на «Крыёне» і цяпер могуць пахваліцца высокім узроўнем аўтаматызацыі ўсяго тэхналагічнага працэсу. Гэта — практычна «бязлюдная» вытворчасць.





На «Крыёне» для «новага завода» ўжо падрыхтавана месца (на старых вызваленых плошчах), закуплена неабходнае абсталяванне; заканчвае адпаведныя праектныя работы інстытут «Белхімпрам». Увод «новага завода» намечаны на канец сёлетняга—пачатак наступнага года. Агульны кошт праекта — каля 10 мільёнаў долараў. Асноўная частка інвестыцыйных сродкаў — з інавацыйнага фонду канцэрна «Белнафтахім».

◆ ◆ ◆

Будучае зніжэнне энергаёмістасці крыёнаўскіх прадуктаў раздзялення паветра, зразумела, павысіць іх канкурэнтаздольнасць. Тым не менш, нягледзячы на гэта, на прадпрыемстве ўжо цяпер заклапочаны праблемай іх збыту. Лунцужок «будзе выраблцца гэтых прадуктаў болей — знізіцца ўдзельная вага энергавыдаткаў — гэтыя прадукты ў выніку стануць таннейшымі» трэба замкнуць дадатковымі рынкамі збыту. «Нашы прадукты не могуць доўга захоўвацца, яны ў выніку могуць лёгка вярнуцца ў тое ж паветра, выпарыцца», — падкрэсліваюць на прадпрыемстве і ўжо цяпер актыўна працуюць менавіта над расшырэннем рынкаў збыту.

◆ ◆ ◆

Якім багаццем сваёй прадукцыі радуюць нас польскія садаводы! Прыгожыя, сакавітыя яблыкі на любы густ. І дзякуй суседзям за гэта. Але ж дзе нашы, беларускія, яблыкі? Кліматычныя ж умовы практычна аднолькавыя. Дзе нашы садаводы? Акрамя знакамітай гаспадаркі «Астрамечава» з Брэстчыны, па сутнасці, і прыгадаць няма каго...

Праблема нашых садаводаў-агароднікаў — застарэлая. У многіх выпадках усё заключаецца ў тым, што вырасціць добры прадукт у нас ужо могуць, а вось захаваць яго — па-ранейшаму не. Між тым, сусветная практыка асвоіла надзейныя тэхналогіі працяглага захоўвання сельгаспрадукту, прычым без усякай шкоды для яго, ці дакладней — без шкоды для яго спажывецкіх якасцяў.

— Як захоўваюць яблыкі ў той жа Польшчы? Запампавалі ў свае вялізныя сховішчы газавае асяроддзе, выцеснілі кісларод і ляжаць яблыкі ў гэтых сховішчах



як свежыя; за рэжымам «назірае» аўтаматыка. Спатрэбілася ўзяць іх — вызвалілі пэўную секцыю ад газу, узялі і — на рынак. У тым ліку і на наш, — каментуюць усю сітуацыю на «Крыёне».

Карацей кажучы, цяпер у еўрапейскіх краінах для працяглага захоўвання сваёй харчовай прадукцыі шырока выкарыстоўваюць герметычныя ўпакоўкі з мадыфікаваным саставам у іх газавага асяроддзя, якое, зразумела, ствараецца спецыяльна (дарэчы, такая ўпакоўка, як больш эфектыўная, прыйшла на змену вакуумнай). Прычым для таго ці іншага прадукту — сваё газавае асяроддзе... Напэўна, зразумела ўжо: абсалютна такія ж эфектыўныя харчовыя газавыя сумесі гатовы прапанаваць нашым сельгасвытворцам і перапрацоўшчыкам іх прадукцыі і на мінскім прадпрыемстве «Крыён». Тут запрашаюць: калі ласка, да супрацоўніцтва.

На жаль, як разам з тым адзначаюць на прадпрыемстве, да такога супрацоўніцтва аказаліся гатовымі толькі нашы мясаперапрацоўчыя камбінаты — яны, у прыватнасці, і карыстаюцца крыёнаўскімі харчовымі газавымі сумесямі. Чаму гэтыя сумесі не выкарыстоўваюцца ў больш шырокіх маштабах? Прычына банальная: таму ж перапрацоўшчыку патрэбна спецыяльнае абсталяванне для ўпакоўкі прадукту ў газавае асяроддзе, адпаведна — патрэбны сродкі, а іх — няма. Праўда, тлумачэнне прычыны, так бы мовіць, ніколькі не грэе спажыўца.

Новую для сябе вытворчасць газавых сумесяў наладзілі на «Крыёне» ў 2003 годзе. Прычым зроблена гэта ў адпаведнасці з планамі па імпартазамяшчэнню ў садружнасці з Беларускім інстытутам метралогіі, і датычылася справа ў першую чаргу так званых паверачных газавых сумесяў. Іх імпартавалі, а балон з такой сумессю каштаваў нямала — 50—100 долараў. А паверачныя газавыя сумесі патрэбны ў розных галінах вытворчасці ў першую чаргу для газааналітычнага кантролю, для ацэнкі дакладнасці паказанняў розных прыбораў... Адпаведна, цяпер ужо з дапамогай крыёнаўскага газавага стандарту выяўляюцца тыя ці іншыя адхіленні ў рабоце гэтых прыбораў, папярэджваюцца аварыйныя сітуацыі. Са з'яўленнем крыёнаўскай прадукцыі попыт на іх на ўнутраным рынку (а ён складае каля 2 тысяч кубічных метраў за год) цалкам задавальняецца ўласнымі сіламі. Аднак, наладзіўшы сваю добрую дапаможную вытворчасць па выпуску газавых сумесяў, на «Крыёне» разам з тым хацелі б развіваць яе далей. Гэта сваё далейшае развіццё тут у першую чаргу і звязваюць з развіццём сваіх найбольш патэнцыяльных на сёння партнёраў — перапрацоўшчыкаў сельгаспрадукцыі.



◆ ◆ ◆

Напэўна, якраз тут будзе дарэчы нагадаць: «Крыён» сам ужо некалькі гадоў мае самыя непасрэдныя адносіны да сельгасвытворчасці. Справа вядомая: далучылі да «Крыёна» зусім развалененае раней сельгаспрадпрыемства — СВК «Міжрэчча» з Дзяржынскага раёна. Пра тое, што гэта было за прадпрыемства на той час, мы ўжо расказвалі. Адзначым толькі: гэта «зліццё» горада і вёскі адбылося каля трох гадоў таму — за гэты час уклаў «Крыён» у свой аграфіліял (у яго тэхнічнае аснашчэнне, у добраўпарадкаванне, «у людзей», або ў іх заработную плату) каля 5 мільярдаў рублёў. Як ідуць справы ў «Крыёна» на аграрным фронце, як цяпер дзейнічае яго філіял «Крыён-Агра», з якімі поспехамі сустракаюць тут ужо сумеснае з працаўнікамі мінскага «Крыёна» свята — Дзень хіміка? Пра гэта мы даведаліся ў намесніка дырэктара «Крыёна» па аграрных пытаннях Уладзіміра Давідзюка. А ён у прыватнасці расказаў: «станоўчая дынаміка ў гаспадарцы — ёсць, растуць яе паказчыкі. Тут, напрыклад, ужо маюць самыя высокія па раёну, у разліку на бала-гектар, надоі малака; нядрэнна развіваецца свінагадоўля. Як ніколі добра, у максімальна сціслы тэрмін, у гаспадарцы адсеяліся. Летась у ёй купілі высокапрадукцыйны трактар «Джо дзір» з навясным абсталяваннем, набылі свой малакавоз; у перспектыве — набыццё МАЗа.

Разам з тым у мінулым годзе трохі пралічыліся з цыбуляй. Пакуль вырасцілі ды сабралі — аказалася, што ўжо не было куды яе рэалізоўваць, рынак быў запоўнены...

Галоўная задача «Крыёна-Агра»: хутчэй упэўнена стаць на «самастойныя» ногі, гаспадарыць без чыёй-небудзь дапамогі. Рабочаму «Крыёна», які працягнуў добры буксір, самому цяпер нялёгка. У яго да таго ж — рэканструкцыя.

◆ ◆ ◆

Сёлета адзначыў 10-годдзе з дня свайго ўтварэння канцэрн «Белнафтахім», у які ўваходзіць «Крыён». Пры гэтым варта тут асобна адзначыць: сёння прадукцыя канцэрна «Белнафтахім» займае больш за 30 працэнтаў у агульнарэспубліканскіх аб'ёмах; каля 35 працэнтаў сваёй прадукцыі прадпрыемствы «Белнафтахіма» экспартуюць, зарабляючы тым самым неабходную для краіны валюту. Якое месца сярод іх займае мінскі «Крыён»?

Як адзначылі ва ўпраўленні канцэрна, гэта адно з найбольш стабільна працуючых у галіне прадпрыемстваў. «Крыён», нягледзячы на тое ж падаражанне энергарэсурсаў, па-ранейшаму з прыбыткам, тэмпы росту тут не змяншаюцца. У канцэрне пры ўсім гэтым спадзяюцца, што тая ж маштабная рэканструкцыя, распачатая на прадпрыемстве, будзе выканана ў крайне сціслы тэрмін.

◆ ◆ ◆

Застаецца дадаць: на «Крыёне» ў свой час паставілі наступную задачу — на адзін кілаграм сваіх прадуктаў раздзялення паветра выдаткоўваць не болей за адну кілават-гадзіну. Гэта — найлепшы сусветны ўзровень, так сказаць — стандарт, якога і трэба дасягнуць. Тая ж маштабная рэканструкцыя і накіравана на гэта.

— Мы павінны моцна трымаць марку свайго прадпрыемства нават у сённяшніх няпростых умовах, калі становіцца ўсё больш складана адшукваць так званыя ўнутраныя рэзервы, — адзначае дырэктар «Крыёна» Яўген Новікаў. — Гэтых унутраных рэзерваў, па сутнасці, ужо і няма. Ёсць толькі адзін рэзерв, а дакладней — адзін шлях: пастаяннае абнаўленне, мадэрнізацыя вытворчасці. З тым, каб быць наперадзе канкурэнтаў, а не даганяць іх. Толькі гэта і можа забяспечыць устойлівае развіццё любога прадпрыемства, спакойнае жыццё любога кіраўніка... А ў заключэнне віншую вас, паважаныя працаўнікі «Крыёна» і канцэрна «Белнафтахім» з Днём хіміка. Шчасця і дабрабыту вам і вашым сем'ям.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**










**НА ЗДЫМКАХ:**

*1. Цыстэрны з прадукцыяй «Крыёна» гатовы да адпраўкі спажыўцам.*

*2. Інжынер-тэхнолаг Яўген БАБАРЫКІН (справа) і машыніст кампрэсарных установак Анатоль ЧАРНІЦКІ.*

*3. На цэнтральным пульце кіравання. Апаратчык Сяргей СЕРГІЕНКА.*

*4. Кантралёр Алена НІКІЦІНА.*

*5. Напаўняльнік балонаў Аляксей ЧУРЫЛА.*

*6. На тэрыторыі прадпрыемства.*

*7. Апаратчык участка прыгатавання газавых сумесяў Аляксей АЛЯКСЕЕЎ.*

*8. Прыёмшчыца балонаў Зоя РАДКЕВІЧ і кранаўшчык Уладзімір КАРПІЕВІЧ.*

*9. Кліенты «Крыёна» «загружаюцца» азотам.*

*10. У цэху прадпрыемства.*

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

**Гісторыя «Крыёна» бярэ свой пачатак з 1956 года, калі былі ўведзены першыя магутнасці па вытворчасці азоту і кіслароду. За больш чым 50 гадоў свайго існавання прадпрыемства істотна нарасціла аб'ёмы вытворчасці, расшырыла гаму сваёй прадукцыі і кола айчынных і замежных спажыўцоў. «Увесь гэты шлях, — падкрэсліваюць на «Крыёне», — мы прайшлі з нашымі заказчыкамі і партнёрамі. Мы заўсёды даражылі і даражым іхняй ацэнкай нашай працы і імкнуліся на працягу ўсяго часу мець самы высокі ўзровень іхняга даверу да нас».**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 МАЯ 2007 г. ПЯТНІЦА № 22 (15473)

# Карона для юнай прынцэсы

**Беларуская каманда заваявала «Гран-пры свету-2007 за фотадызайн» на дзіцячым конкурсе творчасці «Міні-Міс і Міні-Містэр Хрустальная карона-2007», які праходзіў у Маскве. Гэтую і іншую ўзнагароды прывезлі на радзіму прадстаўнікі мінскай імідж-дызайн студыі «Вадалея».**

Дарэчы, конкурс «Міні-Міс і Міні-Містэр Хрустальная карона» праходзіць на працягу 10 гадоў, прычым не толькі ў расійскіх гарадах — Маскве, Санкт-Пецярбургу, Саратаве, Растове, Казані, — але і ў краінах блізкага і далёкага замежжа, напрыклад, у Татарстане, Украіне, Егіпце. Традыцыйна сімвалам конкурсу выступае хрусталь — як увасабленне чыстай, крохкай, але разам з тым шматграннай і бліскучай прыгажосці і таленту.

Самай юнай удзельніцы сёлетняга конкурсу было 4 гады, старэйшым — каля 14. Прадстаўлялі 39 юных паненак і містэраў Расію, Беларусь, Украіну, Казахстан, Татарстан, Польшчу. Спачатку дзеці выступалі ў розных намінацыях на борце цеплахода, пасля давалі гала-канцэрты ў Кастраме і Угліччы, а пераможцы вызначаліся на фінале ў Маскве.

У выніку лепшымі фотадызайнерамі, паводле ацэнак журы, сталі маладыя таленавітыя фотамастачкі Ірына Бышкіна і Людміла Ралько. За «Лепшае партфоліо-2007» была адзначана 9-гадовая мінчанка Насця Гуцікава, якая таксама стала ўладальніцай тытулу «Міні-Міс Хрустальная карона-2007».



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# АПОШНІ ЗВАНОК ЯК ЗАПРАШЭННЕ Ў ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

## Сёння па ўсёй краіне прагучыць школьны званок, які аб'явіць аб наступленні школьных канікулаў



Аднак для некаторых школьнікаў гэты званок будзе апошнім, і азначаць ён будзе наступленне далёка не бесклапотнага, а вельмі адказнага перыяду. І калі дагэтуль жыццё ўсіх школьнікаў на працягу многіх гадоў было амаль што нязменным: заняткі ў школе, гурток ці спартыўныя секцыі, падрыхтоўка хатняга задання і зноў у школу — то пасля апошняга званка вялікая школьная дарога ператворыцца ў безліч асобных сцяжынак, якія выпускнікі будуць пратоптваць ужо ўласнымі сіламі.

Менавіта толькі ў дзень апошняга званка ў гарадах і вёсках нашай краіны можна сустрэць дзяўчат у карычневых сукенках з белым фартушком і гафрыраванымі бантамі ў валасах — апошняя магчымасць апрануць школьную форму, якая некалі была абавязковай для ўсіх. Так што, калі ўбачыце на вуліцах ці ў парках кампаніі маладых людзей са стужкамі «Выпускнік-2007» і прышчэпленымі да адзення званочкамі, не спяшайцеся рабіць ім заўвагі — у іх, мабыць, гэта апошні дзень у жыцці, калі яшчэ можна заставацца дзецьмі і забыцца пра турботы ўступных экзаменаў, ды і ўвогуле дарослага жыцця.

Як стала вядома, сёлета ў Беларусі школу заканчваюць больш за 94 тысячы адзінаццацікласнікаў і каля 70,5 тысяч дзевяцікласнікаў. Выпускнікамі 10-га класа, якія навучаюцца па дванаццацігадовай праграме, у гэтым годзе з'яўляюцца 3719 чалавек.

12-класнікі-«эксперыментатары» таксама ёсць — гэта 483 чалавекі. Такім чынам, запрашэнне ў дарослае жыццё ў выглядзе апошняга званка сёння будзе ўручана каля 200 тысячам беларускіх юнакоў і дзяўчат.

Поспехаў табе, выпускнік-2007, ва ўсіх выпрабаваннях!

**Марына ПЫРКОВА.**
**Фота аўтара.**

# Вольны час маленькіх еўрапейцаў у надзейных руках

**Завяршаецца сяброўскі візіт дэлегацыі Еўрапейскай Асацыяцыі ўстаноў вольнага часу дзяцей і моладзі, якая прыбыла ў Беларусь 14 мая. Прэзідэнт яе — Рэнэ Кларыйс — родам з Галандыі, а яго калегі — прадстаўнікі яшчэ дзесятка краін кантынента: Балгарыі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Украіны, Расіі, Казахстана, Польшчы, Францыі і Чэхіі, прычым гэта далёка не ўсе члены асацыяцыі — туды ўваходзяць 19 краін (у тым ліку і Беларусь).**

У рамках візіту пабывалі дэлегаты і ў Савеце Рэспублікі. Там гасцей сардэчна прымалі Анатоль Новікаў — старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, Алег Захарэвіч — галоўны спецыяліст аддзела па забеспячэнню працы гэтай камісіі, Ала Ралькевіч — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю, Таццяна Краўчанка — член той жа камісіі, Наталля Красоўская — загадчыца аддзела па забеспячэнню працы гэтай камісіі.

Удзельнікі сустрэчы абменьваліся вопытам і абмяркоўвалі міжнароднае супрацоўніцтва. Анатоль Новікаў дэталёва і грунтоўна расказаў пра маладзёжную палітыку ў Беларусі (у прыватнасці, дзяржпраграмы «Дзеці Беларусі», «Моладзь Беларусі», «Маладыя таленты Беларусі» і спецыяльныя фонды) і стан адпаведнай інфраструктуры: дзіцячыя і маладзёжныя тэатры, паркі атракцыёнаў, спартыўна-аздараўленчыя лагеры і іншае. «Чым лепш будзе наладжаны вольны час хлопцаў і дзяўчат, тым менш у іх будзе жадання дрэнна сябе паводзіць», — лічыць Анатоль Мікалаевіч. Не пакінуў ён без увагі і нарматыўна-прававую базу дзяржаўнай палітыкі, скіраваную на падтрымку падрастаючых беларусаў. Наталля Іванаўна расказала пра ўзаемадзеянне ўлады і моладзі — рэгулярныя сустрэчы навучэнцаў з прадстаўнікамі верхняй і ніжняй палат парламента. Цікава паслухаць гасцей — пра што расказвалі яны?

Рэнэ Кларыйс пачаў сваё выступленне з кампліменту:

— Наша Асацыяцыя — зусім маладая, нам толькі 17 гадоў, і дзяўчаты —прадстаўніцы нашай арганізацыі такія ж юныя (жанчыны сярэдніх гадоў пры гэтых словах заўсміхаліся, як дзяўчаты. — **Аўт**.), мы ўсё яшчэ развіваемся! Наша арганізацыя па-за палітыкай, мы падтрымліваем як здольных, таленавітых дзяцей, так і тых, хто нарадзіўся ў няўдалых сем'ях. У Беларусі — багаты вопыт працы з дзецьмі і моладдзю, які мог бы быць карысным для нашай арганізацыі. Наш прыярытэт — пазашкольная сістэма адукацыі, а маштаб — еўрапейскі, варта аб'яднаць вопыт і намаганні ўсіх краін — удзельніц Асацыяцыі, тады праца будзе больш выніковай.

Уладзімір Кісялёў з Расіі (дырэктар Палаца творчасці юных у горадзе на Няве) — віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі, заўважыў, што ў пэўных выпадках кансерватыўнасць патрэбна: напрыклад, у сферы пазашкольнага выхавання. У Беларусі, на яго думку, якраз такая сістэма — традыцыйная, класічная, напрацаваная за многія дзесяцігоддзі.

Дэлегаты цікавіліся таксама, ці не будуць зменены аб'ёмы дзяржаўнага фінансавання маладзёжнай палітыкі Беларусі. Анатоль Новікаў іх супакоіў: «Ніякага скарачэння сродкаў на дзяцей і моладзь не будзе, тут можа быць толькі павелічэнне».

Ужо той факт, што праблемам маладых надаецца столькі ўвагі, абяцае спакой за іх лёс. А калі іх вольны час бяруць на сябе такія разважлівыя і маладыя душой удзельнікі Еўрапейскай Асацыяцыі, тут і казаць няма чаго!

Пасля заканчэння сустрэчы карэспандэнту «Звязды» ўдалося самнасам пагутарыць з вельмі жвавым (хоць ужо і не такім маладым), ветлівым і абаяльным Рэнэ Кларыйсам. Высветлілася, што прэзідэнт Еўрапейскай Асацыяцыі ўстаноў вольнага часу дзяцей і моладзі ведае пра журналісцкую працу не па чутках: ён — галоўны рэдактар часопіса «Маладзёжная палітыка», разлічанага на кіруючае кола і палітыкаў. Рэнэ шчыра ўзрадаваўся, калі пачуў, як я размаўляю па-англійску — маўляў, можна будзе абысціся без перакладчыка.

Перш-наперш мы абмеркавалі з Рэнэ Кларыйсам наведванне дэлегацыяй дзіцячых устаноў:

— Нас уразіў Палац дзяцей і моладзі — велічэзны будынак з мноствам магчымасцяў, нездарма там праводзіць свой вольны час 8 тысяч дзяцей кожны тыдзень. І самае прыемнае, што нас больш за ўсё здзівіла, дык гэта моцная фінансавая падтрымка з боку дзяржавы (сацыяльна-арыентаваная экономіка ўсё ж не пусты гук. — **Аўт.**). Мае калегі па-добраму пазайздросцілі: Галіне Шкляр (дырэктару Палаца. — **Аўт**.) не трэба шукаць спонсараў, зацікаўленых асобаў, яна можа сканцэнтравацца на працы цэнтра. Усім нам запомніліся піянеры ў Палацы дзяцей і моладзі і, шчыра прызнаюся, толькі зараз, калі Валдас сказаў пра юбілей, мы зразумелі, з якой нагоды яны там былі!

Не ўтрымалася я і ад банальнага «Як Вам Мінск?». Не паверыце, нашага госця сталіца літаральна шакіравала:

— Я быў настроены ўбачыць шэрасць, сціпласць — менавіта такі вобраз прадстаўляюць нам СМІ, а тут раптам зялёны, квяцісты, неверагодна чысты горад! — дзеліцца сваімі ўражаннямі Рэнэ Кларыйс. — Гэткі ж негатыўны стэрэатып быў у большасці ўдзельнікаў нашай дэлегацыі, аднак тое, што мы ўбачылі ў Мінску, нам спадабалася. Гэта ўсё ж пытанне адказнасці журналістаў і, як ваш калега, я магу з упэўненасцю сказаць, што для прадстаўнікоў менавіта гэтай прафесіі вельмі важна быць праўдзівымі, аб'ектыўнымі. Так што адна з галоўных высноў нашай паездкі — правільнае меркаванне пра краіну і яе народ не сфарміруецца да таго часу, пакуль не наведаеш яе, не пабачыш усё на свае вочы!

Цудоўна, што негатыўныя стэрэатыпныя ўяўленні пра Беларусь рушацца пасля яе наведвання. Толькі хацелася б, каб наведвальнікаў было больш — мы з радасцю чакаем гасцей!

**Ала МАЧАЛАВА.**

## РАЗВІТАННЕ СА ШКОЛЬНЫМ ЮНАЦТВАМ...

**25 мая ва ўсіх навучальных установах Беларусі прагучаць апошнія школьныя званкі. Сёлета пуцёўку ў дарослае жыццё атрымаюць каля 70,5 тысячы дзевяцікласнікаў і больш за 94 тысячы выпускнікоў агульнай сярэдняй школы.**

Наперадзе іх чакае даволі напружаны экзаменацыйны графік. Выпускнікі базавай школы здаюць чатыры абавязковыя іспыты: пісьмовыя экзамены па беларускай, рускай мове, матэматыцы і гісторыі Беларусі. А выпускнікам XI (XII) класаў агульнаадукацыйных школ трэба будзе здаць усяго тры выпускныя іспыты. Абавязковым з'яўляецца экзамен па адной з дзвюх дзяржаўных моў (беларускай ці рускай), які праводзіцца ў форме пераказу, і пісьмовы экзамен па матэматыцы. Трэці экзамен па выбару выпускніка праводзіцца, як правіла, у вуснай форме. Выпускныя экзамены стартуюць для адзінаццацікласнікаў 28 мая, а ўжо 12 чэрвеня ў краіне распачынаецца цэнтралізаванае тэсціраванне.

8—9 чэрвеня ў беларускіх школах пройдуць выпускныя вечары. Дарэчы, права вызначаць дату, месца і працягласць выпускных вечароў Міністэрства адукацыі прадаставіла адміністрацыям навучальных устаноў сумесна з бацькоўскімі камітэтамі, якія павінны ўзгадніць сваё рашэнне з мясцовымі органамі ўлады. У сталіцы, напрыклад, вырашылі праводзіць выпускныя вечары 9 чэрвеня, прычым непасрэдна ў школах, а не ў рэстаранах і кафэ.

А для выпускнікоў базавай школы святочныя развітальныя мерапрыемствы пройдуць 12—13 чэрвеня. Між іншым, некаторыя дзевяцікласнікі яшчэ да здачы выпускных экзаменаў вырашылі свой далейшы лёс, здаўшы паспяхова ўступныя іспыты ў Ліцэй БДУ. Сярэдні конкурс у гэту прэстыжную навучальную ўстанову, чые выхаванцы пастаянна збіраюць узнагароды на рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах, склаў сёлета 5,5 чалавека на месца. А самымі папулярнымі аказаліся матэматычны (7,2 чалавека на месца) і філалагічны профілі навучання (7,8 чалавека).

У гэтым годзе вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, якія ажыццяўляюць прыём навучэнцаў на базе агульнай сярэдняй адукацыі, яшчэ не адчуюць наступстваў дэмаграфічнага правалу. А вось колькасць выпускнікоў базавай школы сёлета ўдвая меншая, калі параўноўваць з папярэднім годам. Сёння нават цяжка прадказаць, які будзе план набору праз два гады ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Творчыя кантакты

# Журналісцкі семінар у Вілейцы

**Семінар, прысвечаны праблемам падрыхтоўкі прафесійных кадраў для рэгіянальных СМІ, адбыўся ў Вілейцы. Тут сустрэліся выкладчыкі факультэта журналістыкі БДУ, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі, Мінскага аблвыканкама, кіраўнікі шэрагу раённых аддзелаў адукацыі і рэдакцый раённых газет.**

Стратэгія адбору таленавітай моладзі з ліку выпускнікоў сярэдніх школ, праблемы паляпшэння падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі прафесійных журналісцкіх кадраў — гэтыя пытанні былі прыярытэтнымі на семінары. Разам з супрацоўнікамі факультэта журналістыкі БДУ кадравыя перспектывы мясцовых СМІ абмяркоўвалі кіраўнікі райаддзелаў народнай адукацыі і галоўныя рэдактары газет Вілейскага, Лагойскага, Маладзечанскага, Валожынскага і Мядзельскага раёнаў.

Дэкан факультэта журналістыкі БДУ С. Дубовік падкрэсліў, што семінар у Вілейцы — другая «куставая» сустрэча ў Мінскай вобласці за апошні час. Кантакты факультэта журналістыкі з рэгіёнамі пашыраюцца — ужо адбыліся творчыя нарады з кіраўнікамі мясцовых выданняў Гродзеншчыны, Гомельшчыны і Брэстчыны. І далёка не выпадкова найстарэйшая ў СНД установа па падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў у маі 2007 г. стала пераможцам III Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Ліцера» ў намінацыі «Партнёрства».

Сёння ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь адчуваецца дэфіцыт спецыялістаў з дыпломам журналіста. За апошнія гады імкліва вырасла колькасць газет, часопісаў, агенцтваў, тэлеканалаў — попыт на маладых спецыялістаў значна апярэджвае прапановы. З 90 бюджэтнікаў па размеркаванню ў раённы друк накіраваны толькі 20. Дзе ж браць кваліфікаваных спецыялістаў? Магчымае выйсце — павялічваць мэтавы набор на стацыянар па заяўках мясцовых СМІ, вучыць кадры для раённых выданняў на завочным аддзяленні журфака, весці прафесійную падрыхтоўку супрацоўнікаў рэдакцый, якія ўжо маюць дыпломы іншых ВНУ.

Перспектывы развіцця факультэта журналістыкі БДУ звязаны са здачай у эксплуатацыю ў 2007/2008 навучальным годзе сучаснага аўдыторнага корпуса па вуліцы Кальварыйскай. Ва ўрадавых дакументах аб развіцці журналісцкай адукацыі і сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь вызначаны прыярытэтныя накірункі дзейнасці нацыянальнай школы журналісцкіх кадраў на бліжэйшыя гады. У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта створана творчае маладзёжнае тэлерадыёаб'яднанне пры факультэце, абсталёўваецца тэлестудыя, набываецца сучасная відэатэхніка.

Факультэт займаецца прафарыентацыяй школьнікаў і моладзі, пры ім дзейнічаюць васьмімесячныя падрыхтоўчыя курсы, выкладчыкі праводзяць выязныя курсы-семінары для журналістаў рэгіянальных выданняў. Наша задача не толькі ў тым, каб наладзіць увесь ланцужок падрыхтоўкі кадраў для газет, часопісаў, радыё і тэлебачання, але і распрацаваць формы падтрымкі маладых журналісцкіх талентаў з дапамогай алімпіяд, творчых конкурсаў. У перспектыве мяркуем правядзенне на факультэце Дзён абітурыента і майстар-класаў вядомых журналістаў для тых, хто хоча бліжэй пазнаёміцца з будучай прафесіяй.

Праблемы і перспектывы журналісцкай адукацыі закранулі ў сваіх выступленнях саветнік міністра адукацыі, прафесар В. Іўчанкаў, намеснік начальніка ідэалагічнага ўпраўлення Мінаблвыканкама Т. Хмель, галоўны спецыяліст упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі А. Шычко, загадчыкі кафедраў факультэта журналістыкі БДУ — дацэнт А. Свораб, прафесар Т. Дасаева, дацэнт В. Булацкі. Вопытам работы з юнымі карэспандэнтамі ў рэдакцыях СМІ падзяліліся галоўны рэдактар вілейскай газеты «Шлях Перамогі» М. Кузаўкіна і галоўны рэдактар «Маладзечанскай газеты» А. Хазянін.

Удзельнікі семінара азнаёміліся са славутымі мясцінамі Вілейшчыны, наведалі рускія ваенныя могілкі часоў Першай сусветнай вайны каля в. Забродздзе. Выкладчыкі факультэта журналістыкі правялі ў сценах гімназіі № 2 Дзень адчыненых дзвярэй и майстар-клас для будучых абітурыентаў, расказалі аб умовах прыёму на факультэт журналістыкі, адказалі на пытанні аб асаблівасцях творчага конкурсу. А вечарам школьнікі і маладыя жыхары райцэнтра сталі ўдзельнікамі дабрачыннага канцэрта «Мой свет — БДУ», арганізаванага кіраўніцтвам студэнцкага гарадка ўніверсітэта.

**Пётр ДАРАШЧОНАК,**
**загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры БДУ, дацэнт.**

# «ЦЁРКІН» ДЛЯ НАВУЧЭНЦАЎ

**Полацкі гаркам БРСМ арганізаваў для навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ваенна-спартыўную гульню «Цёркін- 2007».**

Прозвішча знакамітага літаратурнага героя для назвы гульні выбрана не выпадкова. Востры розум і аптымізм так патрэбны зараз, калі, не сакрэт, прэстыж ваеннай службы не такі высокі, як калісьці. Гульцы бралі ўдзел у спартыўнай эстафеце, стралялі з пнеўматычнай вінтоўкі, хадзілі строем і інш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ»**
**объявляет прием абитуриентов в 2007 году**
***по следующим специальностям:***
***очная форма обучения (на бюджетной и платной основе)***

**ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ**
Специальности — актерское искусство драматического театра и кино, режиссура художественного фильма, режиссура телевидения, звукорежиссура, телеоператорство, кинооператорство,
**ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ФАКУЛЬТУТ**
Специальности — станковая живопись, графика, монументально-декоративное искусство, скульптура.
**ФАКУЛЬТЕТ ДИЗАЙНА И ДЕКОРАТИВНО-ПРИКЛАДНОГО ИСКУССТВА**
Специальности — декоративно-прикладное искусство (художественное стекло, художественная керамика; художественное ткачество, моделирование костюма), дизайн средств производства и транспорта, дизайн мебели, дизайн интерьеров, экспозиционный дизайн, графический дизайн, дизайн виртуальной среды, телереклама.
***На платной основе:***
***Специальность — фотографика.***
***Заочная форма обучения (на бюджетной и платной основе)***
**ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ**
Специальности — режиссура телевидения, звукорежиссура, телеоператорство, искусствоведение (театроведение)
***На платной основе:***
Специальности — актерское искусство драматического театра и кино, режиссура драмы.
Прием заявлений на очную и заочную форму обучения проводится с 5 по 11 июля включительно, вступительные испытания — с 12 по 22 июля.
Поступающие в Академию представляют сертификаты о результатах централизованного тестирования по белорусскому или русскому языку и истории Беларуси и сдают экзамены по дисциплине «Творчество».
В академии действуют подготовительные курсы по рисунку, живописи, композиции, актерскому мастерству, режиссуре.
Консультации для абитуриентов проводятся:
- на театральном факультете — по вторникам с 17.00 до 19.00 и воскресеньям с 12.00 до 14.00 в аудиториях.
- на художественном факультете и факультете дизайна и декоративно-прикладного искусства — на кафедрах ежедневно, кроме субботы и воскресенья.
**Адрес Академии:**
220012, г. Минск, пр. Независимости, 81.
Справки по телефонам: 292-12-21 — театральный факультет,
231-34-78 — художественный факультет,
292-51-53 — факультет дизайна и декоративно-прикладного искусства.

# СІЛА — У ВЕДАХ. А ВЕДЫ — ЗА ГРОШЫ?

## Вырашана рэпетытарства легалізаваць, а ў дашкольных установах увесці пасаду педагогаў-гувернёраў

**Ці могуць школьныя педагогі перахапіць ініцыятыву ў рэпетытараў? Чаму рэпетытарства з'яўляецца ў нашай краіне ценявым бізнэсам? Ці могуць школы займацца падрыхтоўкай сваіх вучняў да паступлення ў ВНУ на дагаворнай аснове? Гэтыя пытанні паставіў на калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. А тэмай размовы стала развіццё ў сістэме адукацыі платных паслуг. «Ва ўсім свеце даўно зразумелі, што самае выгаднае ўкладанне сродкаў — укладанне іх у адукацыю, — падкрэсліў міністр. — Запатрабаванасць адукацыйных паслуг сёння каласальная, і мы павінны максімальна іх развіваць, каб задаволіць попыт насельніцтва».**

Усяго ў 2006 годзе ўстановамі адукацыі аказвалася 50 відаў платных паслуг. У параўнанні з 2000 годам колькасць відаў паслуг павялічылася больш чым у 2,5 раза. Між іншым, упершыню за апошнія 5 гадоў прагнозны паказчык тэмпа росту платных паслуг не ўдалося выканаць. Прычыны агучыла начальнік упраўлення сацыяльна-эканамічнага развіцця міністэрства Лідзія Субоцкая. Самая галоўная прычына — гэта стан матэрыяльна-тэхнічнай базы нашых навучальных устаноў, дзе не хапае вучэбных і лабараторных плошчаў, адчуваецца (асабліва ў сталіцы) востры дэфіцыт месцаў у студэнцкіх інтэрнатах. Заплаціць за навучанне свайго дзіцяці ды яшчэ і за арэнду пакоя ў кватэры могуць далёка не ўсе беларускія сем'і. А замежных грамадзян, якія хочуць атрымліваць вышэйшую адукацыю ў беларускіх ВНУ, умовы пражывання ў нашых студэнцкіх інтэрнатах катэгарычна не задавальняюць. Яшчэ адна прычына — дэмаграфічная яма, у якой мы апынуліся. Упершыню ў 2006 годзе адбылося змяншэнне прыёму на платную завочную форму навучання. Прычынамі сталі таксама адмена ў краіне платнага цэнтралізаванага тэсціравання, скарачэнне плана падрыхтоўкі спецыялістаў па асобных запатрабаваных моладдзю спецыяльнасцях (эканамічных і юрыдычных), увядзенне ліцэнзійных патрабаванняў да максімальнай колькасці студэнтаў і навучэнцаў-платнікаў, і ўстанаўленне прагнознага паказчыка інфляцыі.

Між іншым, асноўную частку заробленых грошай у сістэме адукацыі складаюць даходы вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, атрыманыя ад падрыхтоўкі спецыялістаў на платнай аснове. У 2006 годзе сярэдні кошт навучання ў ВНУ, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, склаў 940 долараў ЗША на дзённай і 443 долары — на завочнай форме навучання. У ССНУ сярэдні кошт навучання склаў 570 долараў ЗША на дзённай і 228 долараў — на завочнай. У той жа час для падрыхтоўкі на дзённай форме навучання сярэднестатыстычнага студэнта-бюджэтніка патрабавалася сума ў 1360 долараў ЗША без уліку выплаты стыпендыі, а навучэнца ССНУ — 1121 долар ЗША, зноў без уліку выплаты стыпендыі. Самы высокі кошт навучання ( 2098 долараў ЗША) устаноўлены на спецыяльнасцях «Лячэбная справа» і «Педыятрыя» ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, на спецыяльнасцях «Міжнароднае права», «Міжнародныя адносіны», «Сусветная эканоміка», «Правазнаўства», «Эканамічнае права» і «Мытная справа» ў БДУ (1636 долараў ЗША), а таксама на спецыяльнасцях «Лінгвіст, выкладчык англійскай і нямецкай мовы», «Перакладчык-рэферэнт» у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце — 1586 долараў.

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах самы высокі кошт навучання ўстаноўлены ў Гродзенскім педагагічным каледжы на спецыяльнасці «Музычная адукацыя» (1140 долараў ЗША) і юрыдычным каледжы БДУ на спецыяльнасці «Правазнаўства» (1051 долар ЗША).

Параўнальны аналіз кошту падрыхтоўкі спецыяліста за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове паказаў, што толькі ў 6 ВНУ на асобных спецыяльнасцях устаноўлены кошт, які перавышае выдаткі бюджэту на падрыхтоўку спецыяліста. У 16 ВНУ кошт складае 70 і больш працэнтаў, а ў 6 ВНУ ён не дацягвае нават да 70 працэнтаў.

Сярод ССНУ толькі ў адной навучальнай установе кошт платы за навучанне перавышае выдаткі бюджэту на падрыхтоўку спецыяліста. У 17 ССНУ ён вагаецца ад 50 да 70 працэнтаў, а ў 18 — складае менш за 50 працэнтаў.

Узровень рэнтабельнасці пры вызначэнні кошту платнай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтым навучальным годзе ў падпарадкаваных Мінадукацыі ВНУ склаў у сярэднім 17,2 працэнта. Без уліку прыбытку сфарміраваны кошт на асобных спецыяльнасцях у БДУ, БНТУ, Беларуска-Расійскім універсітэце, Віцебскім і Гродзенскім дзяржаўных універсітэтах. Максімальна дазволеная 30-працэнтная рэнтабельнасць устаноўлена пры вызначэнні кошту навучання па асобных спецыяльнасцях у 13 ВНУ.

Фактарамі, якія стрымліваюць павелічэнне кошту навучання, з'яўляецца не толькі стан матэрыяльна-тэхнічнай базы, але і ўстанаўленне прагнознага паказчыка інфляцыі (у 2007 годзе — 0,5 працэнта ў месяц), і, што немалаважна, плацежаздольнасць насельніцтва.

Аляксандр Радзькоў прапанаваў эканамічна адрэгуляваць кошт навучання ў залежнасці ад патрэбы нашай дзяржавы ў тых ці іншых спецыялістах. Скажам, сёння ў школах адчуваецца востры недахоп фізікаў, матэматыкаў і настаўнікаў інфарматыкі, затое ўсе імкнуцца паступаць на спецыяльнасці, звязаныя з выкладаннем замежных моў, міжнароднай эканомікай і правам. Магчыма, там трэба ўстанавіць такі высокі кошт, каб пакрываць выдаткі на падрыхтоўку патрэбных народнай гаспадаркі спецыялістаў, а для апошніх устанавіць мінімальную плату за навучанне. Лідзія Субоцкая выказалася за закрыццё прыёму ў ВНУ на некаторыя спецыяльнасці на бюджэтнай аснове, дзе існуе перавытворчасць кадраў, і пакінуць там навучанне толькі на платнай аснове. А вызваленыя бюджэтныя сродкі выкарыстаць для адкрыцця новых спецыяльнасцяў.

Цяперашніх студэнтаў наўрад ці абрадуе намер Міністэрства адукацыі ўвесці плату за прапушчаныя студэнтамі-бюджэтнікамі вучэбна-лабараторныя заняткі, а таксама пераздачу экзаменаў і залікаў. Зараз спецыялісты Міністэрства працуюць над юрыдычным і эканамічным бокам гэтага пытання.

Што датычыцца ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, то Закон Рэспублікі Беларусь «Аб агульнай сярэдняй адукацыі» забараняе ўстанаўліваць для іх нарматывы планавання даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці, у тым ліку і па аказанню платных паслуг. Аднак, як заўважыў міністр, закон і не забараняе аказваць у агульнаадукацыйных установах платныя паслугі.

Летась установамі агульнай сярэдняй адукацыі было аказана платных паслуг на агульную суму 13 млрд рублёў, і калі параўноўваць гэту лічбу з іншымі ўзроўнямі адукацыі, атрымліваецца вельмі нязначная сума. Разам з тым, на думку Лідзіі Субоцкай, ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі маюцца вельмі добрыя рэзервы для развіцця платных паслуг: добрая матэрыяльна-тэхнічная база і кадравы патэнцыял.

— Мы падлічылі, што прыкладна 50 працэнтаў абітурыентаў ВНУ і 20 працэнтаў абітурыентаў ССНУ карыстаюцца паслугамі рэпетытараў, — падзялілася сваімі разважаннямі Лідзія Субоцкая. — Асабліва актывізуецца рэпетытарства за паўгода да старту прыёмнай кампаніі. Калі б нам удалося перавесці рэпетытарства на базу агульных сярэдніх, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то мы маглі б дадаткова зарабіць больш як 4 млрд рублёў. Пры гэтым мы ўзялі толькі 2 гадзіны заняткаў у тыдзень і мінімальную суму за адну гадзіну заняткаў — 3 долары ЗША. У газеце «ВаБанкъ» ёсць спецыяльная старонка, дзе рэкламуюцца адукацыйныя паслугі. Акрамя рэкламы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, я там больш прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў адукацыі не знайшла. У асноўным рынак платных адукацыйных паслуг захоплены прыватнікамі.

Але, як высветлілася, у аказанні платных адукацыйных паслуг ёсць і падводныя камяні. Па-першае, калі размова ідзе аб падрыхтоўцы да паступлення, то бацькі аддаюць перавагу індывідуальным заняткам. Па-другое, індывідуальныя платныя заняткі прыносяць школам толькі галаўны боль. Паводле слоў начальніка фінансава-эканамічнага аддзела ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Віктара Кішкеля, у школах Ленінскага раёна горада Магілёва арганізаваныя індывідуальныя платныя заняткі. Кошт заняткаў складае 8 тысяч 280 рублёў. У яго ўваходзіць заработная плата педагога (4821 рубель), налічэнні на яе, выдаткі на аплату камунальных паслуг, падаткі, непадатковыя плацяжы і г.д. У выніку навучальная ўстанова атрымлівае чысты прыбытак у 288 рублёў. Дык ці можна лічыць гэту суму прыбыткам? У чым заключаецца карысць для школы? А рэпетытар проста ціхенька пакладзе ў кішэню заробленыя грошы і ні з кім не стане дзяліцца.

На думку Віктара Кішкеля, дзеючая сістэма падаткаабкладання не спрыяе развіццю платных паслуг. Да таго ж пры распрацоўцы планаў па аказанню платных паслуг трэба ўлічваць дэмаграфічную сітуацыю, а таксама тэрытарыяльную спецыфіку. У Магілёўскай вобласці пачынаючы з 1999/2000 навучальнага года кантынгент навучэнцаў школ і выхаванцаў дашкольных устаноў змяншаецца штогод на 5—8 тысяч чалавек. Групы ў сельскіх дзіцячых садках і класы ў школах — малакамплектныя. Напаўняльнасць тых жа класаў складае ўсяго 5—8 чалавек. А сельскіх школ — 69 працэнтаў ад агульнай колькасці школ у вобласці. Дадзеная малакамплектнасць не дазваляе забяспечыць напаўняльнасць нават тых гурткоў, якія прадугледжаны за кошт гадзін школьнага кампанента. А не забяспечыўшы напаўняльнасць гэтых гурткоў, нельга адкрываць платныя. Да таго ж і плацежаздольнасць вяскоўцаў даволі нізкая.

У дзіцячых дашкольных установах да найбольш перспектыўных платных паслуг адносяць стварэнне груп кароткачасовага знаходжання і арганізацыю дадатковага знаходжання дзіцяці ў садку ў выхадныя дні, у вячэрні час і нават у начныя гадзіны.

— Мы лічым, што такія паслугі педагогі могуць аказваць у тым ліку і дома, калі ёсць у гэтым патрэба, — падкрэсліў Віктар Кішкель. — Для дзіцяці выхавальнік — блізкі чалавек. І бацькам не давядзецца за сваё дзіця хвалявацца. Але трэба распрацаваць інструкцыю па арганізацыі гэтага віду платных паслуг, а таксама палажэнне аб аплаце працы педагога-гувернёра.

Падчас дыскусіі аб перспектывах пераводу рэпетытарства, так бы мовіць, на легальную аснову, была выказана і наступная трывожная думка. А ці не атрымаецца так, што асобныя школьныя настаўнікі будуць вымушаць дзяцей хадзіць на платныя індывідуальныя заняткі пад пагрозай атрымання ў атэстаце больш нізкай адзнакі. Асабліва цяпер, калі сярэдні бал школьнага атэстата бярэцца пад увагу пры паступленні. Тут ёсць над чым задумацца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Баранавіцкі малочны камбінат»:

# шматгадовыя традыцыі якасці, памножаныя на час

**ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» — адно з буйнейшых прадпрыемстваў малочнай прамысловасці Брэсцкай вобласці, якое эфектыўна працуе і мае значныя вытворчыя магутнасці, калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў са шматгадовым вопытам работы ў адпаведнай галіне**



Шмат моладзі працуе на прадпрыемстве. Алеся ЮРЧЫК прыйшла сюды працаваць пасля вучобы ў прафтэхкаледжы. Цяпер яна вопытны аператар і павышае адукацыю ў Магілёўскім універсітэце кіравання.

## Аднаму з лідараў малочнай галіны рэспублікі — 63 гады

*Айчынны рынак малочных прадуктаў сёння з упэўненасцю можна назваць надзвычай багатым. Што ні кажыце, а ледзь не ў кожнага з нас у свядомасці ўжо даўно адбыўся лікбез па асваенню шырокага асартыменту прадуктаў з малака. Традыцыйны пералік са смятаны, кіслага малака, масла, сыру, марожанага, тварагу і ражанкі ўжо даўно лічыцца ўрэзаным. Цяпер пальцаў на абедзвюх руках не хопіць, каб пералічыць, што можна вырабіць з малака. Гэты пералік могуць дапоўніць біфідакефіры, маянэзы, соусы, глазураваныя сыркі, у тым ліку ў шакаладзе, ёгурты з разнастайнымі натуральнымі напаўняльнікамі, сыроваткі, прадукты з пахты, лячэбна-прафілактычныя біфітаты і шэраг іншых. Ды і ў традыцыйным асартыменце, асабліва гэта датычыцца малака і кефіру, зараз частымі спадарожнікамі з'яўляюцца вітамінныя дабаўкі. Выпіў увечары ці раніцай шклянку такога напою — лічы, што дзень пройдзе ці прайшоў недарэмна.*

*Прыемна, што людзі пачалі разбірацца належным чынам у якасці і карысці прадукцыі таго ці іншага малочнага камбіната, што адразу адбілася на «каціроўцы» іх папулярнасці. Не дзіўна, што сёння сярод шматлікіх беларускіх вытворцаў разгараецца нежартоўная барацьба за кліента. Зараз важна не толькі вырабіць якасны малочны тавар, але і ўмець прыгожа падаць яго пакупніку, ад чаго напрамую залежыць поспех у рэалізацыі малочнай прадукцыі.*

*Без сумненняў, што сярод тых, хто ўвесь час трымае руку на пульсе і стараецца максімальна задаволіць апетыты самага запатрабавальнага пакупніка, — адкрытае акцыянернае таварыства «Баранавіцкі малочны камбінат». Пачаўшы свой адлік адразу пасля вызвалення Беларусі, у далёкім 1944 годзе, калі ў вытворчым партфелі было толькі 13 найменняў тавару, прадпрыемства хуткімі тэмпамі набірала ход і зараз з'яўляецца адным з лідараў на беларускім рынку па многіх пазіцыях, выпускаючы каля сотні відаў малочнай прадукцыі пад сапраўднай беларускай гандлёвай маркай «Раніца». У гэтай назве ёсць нешта загадкавае. Магчыма, што пакупнікі пры набыцці малака ці смятаны з гэтым таварным знакам успамінаюць прыказку «Думай з вечара, а рабі з раніцы». Гэта ўжо вялікі плюс. Да таго ж амаль кожны чалавек, які хоць крыху знаёмы з сялянскім бытам, ведае, што першы надой ад каровы заўсёды прыходзіцца на раніцу... А малако свежае, сырадой! Як бы там ні было, прадукцыя ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» з гандлёвай маркай «Раніца» мае ў шматлікіх пакупнікоў устойлівы попыт, што лепш за ўсё сведчыць аб плённай рабоце ўсяго працоўнага калектыву прадпрыемства.*



— Нашы вырабы самыя смачныя і самыя карысныя, — зацвердзілі мікрабіёлаг Наталля КАВАЛЕНКА і спецыяліст па маркетынгу Алена КАРАНЕЎСКАЯ.

## З ГІСТОРЫІ

**20 ліпеня 1944 года** — створаны Баранавіцкі малочны камбінат у адпаведнасці з прыказам Народнага камісарыята мясной і малочнай прамысловасці БССР.

На пачатку жніўня Гармалкамбінат, які базіраваўся ў падвальным памяшканні спаленага завода, даў першую прадукцыю для закрытых і дзіцячых устаноў горада.

Адначасова з вытворчасцю малочнай прадукцыі вяліся аднаўленчыя работы, будаўніцтва цэхаў, мантаж новага абсталявання.

Да канца 1944 года на заводзе, дзе працавала менш за два дзесяткі чалавек, перапрацавана 303 тоны малака.

**1945 год** — тэмпы вытворчасці растуць: перапрацавана 626 тон малака, выраблена 20 тон масла і 90 тон натуральнамалочнай прадукцыі.

**1947 год** — у строй уведзена ўласная кацельня.

**1948 год** — пабудавана масласырбаза для захоўвання малочнай прадукцыі.

У 50-я гады працягваецца работа па механізацыі вытворчасці.

**1964 год** — здаецца ў эксплуатацыю новы гарадскі малочны завод, пабудаваны ў паўднёва-заходняй частцы г. Баранавічы з чыгуначнай веткай для адпраўкі прадукцыі. Магутнасць камбіната — 30 тон перапрацоўкі малака ў змену.

**1971 год** — адбываецца аб'яднанне Баранавіцкага гармалзавода з Баранавіцкай масласырбазай і Ляхавіцкім масласырзаводам з адзіным вытворчым планам. У наступныя гады завод мадэрнізаваўся, на змену састарэламу абсталяванню прыйшлі больш сучасныя машыны і аўтаматы.

**1972 год (снежань)** — за высокія паказчыкі ў рабоце і ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР Гармалзавод узнагароджаны Ганаровай граматай і памятным Чырвоным Сцягам беларускага ўрада і прафсаюзаў.

**1978 год** — пачалася рэканструкцыя асноўнай вытворчасці.

**1982 год (снежань)** — падпісаны акт Дзяржаўнай камісіі аб здачы ў эксплуатацыю першай чаргі Гармалзавода: у прасторных вытворчых пабудовах размясціліся прыёмна-апаратны ўчастак, участак разліву. Здадзены ў эксплуатацыю адміністрацыйны корпус з медпунктам, сталовай і актавай залай.

**1983 год** — загадам Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці БССР Баранавіцкі гармалзавод перайменаваны ў малочны камбінат.

**1984 год** — завяршылася рэканструкцыя другой чаргі малкамбіната, вытворчыя магутнасці прадпрыемства па перапрацоўцы малака склалі 100 тон у змену.

**1992 год** — здадзены ў эксплуатацыю цэх сухога абястлушчанага малака (САМ). Ён аснашчаны новым прагрэсіўным абсталяваннем, на якім укаранёны новыя тэхналогіі вытворчасці сухіх малочных прадуктаў. З пускам цэха САМ камбінат мае магчымасць 100-працэнтнага выкарыстання адгону сыроваткі на перапрацоўку. З уводам у эксплуатацыю цэха САМ камбінат пераўтварыўся ў буйнейшы прамысловы комплекс з безадходнай перапрацоўкай малочнай сыравіны.

**1992 год** — адкрываецца фірменны магазін «Верас», кафэ «Валошка», бар «Верас».

**1994 год** — завод перайменаваны ў ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат». Ініцыятарам акцыянавання выступіў працоўны калектыў.

**2000 год** — да камбіната далучана структурнае падраздзяленне «Райаграпрамтэхніка», што дазволіла рабіць хуткі і якасны рамонт абсталявання для гаспадарак-партнёраў.

ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» працуе са шматлікімі гаспадаркамі Баранавіцкага, Ганцавіцкага, Нясвіжскага, Навагрудскага і Карэліцкага раёнаў.

**2007 год** — тут выпускаецца звыш 90 найменняў разнастайнай малочнай прадукцыі: натуральнамалочная, плаўленыя сыры, масла, сухія малочныя і згушчаныя прадукты, марожанае, маянэзы, соусы.

### НА ЗДЫМКАХ:

1. Пробу на вызначэнне якасці бярэ лабарант Ірына ЗЫЛЬ.
2. Даследаванне прадукцыі ў стэрыльным боксе праводзяць вядучы мікрабіёлаг Алена КАЛІНОЎСКАЯ і мікрабіёлаг Тамара АКУЛІЧ.
3. Гэтага рулона з вокладкай для марожанага аўтамату хапае на сем гадзін беспераблойнай працы, — патлумачыў слесар Аляксандр ГАСТЭЛА.
4. Частка расфасаванага на прадпрыемстве малака ў пакетах праходзіць праз канвеер, за якім працуе Алена КАЛЕЙЧЫК.
5. Пламбір з разынкамі выпрацоўваюць на ўчастку, якім кіруе майстар Ніна АМЕЛІНА.
6. «У нашым фірменным магазіне заўжды самая свежая прадукцыя», — сказала нам прадавец Вольга ГАЛАВАЧОВА.
7. Усе сакрэты вытворчасці прадуктаў з малака вядомы галоўнаму тэхнолагу Ларысе АМБРАЖЭВІЧ.
8. Радуюць вока кветкі, якіх удосталь на двары прадпрыемства.
9. Вадзіцель Сяргей ХІТРЫК працуе на прадпрыемстве 17 гадоў.

***Высокая якасць прадукцыі, якая сыходзіць з канвеера ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат», пацвярджаецца наяўнасцю сертыфіката якасці стандарту ISO 9001, а таксама сертыфіката вытворчасці на аснове прынцыпаў ХАССП***




## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

Сказаць, што сёння кіраўніцтва прадпрыемства, аддзел галоўнага тэхнолага і каманда маркетынгу з усіх сіл імкнуцца вырабляць якасную і недарагую прадукцыю і ахопліваць як мага большы рынак збыту — значыць не сказаць нічога.

Парадак перш за ўсё і на любым участку вытворчасці — такі прынцып работы закладзены дырэктарам у цяперашняй вытворчасці. У свядомасці практычна кожнага работніка камбіната ўжо закладзена думка аб тым, што ён павінен як у сябе дома ўпраўляцца на канвееры і прыкладваць максімум намаганняў, каб рэкламаваць прадукцыю гандлёвай маркі «Раніца» не толькі на ўнутраны, але і на знешні рынкі. Невыпадкова, што зараз кліентамі прадпрыемства з'яўляюцца пакупнікі з многіх рэгіёнаў свету. Прычым работа са спажыўцамі, як правіла, наладжана па перадаплаце.

Вядома, што надзвычай важнай складовай поспеху дзейнасці любога прадпрыемства з'яўляецца вялікі партфель прапаноў з прывабнымі цэнамі і адмысловай прадукцыяй. У гэтым плане, сцвярджаюць на заводзе, на ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» усё на высокім узроўні. Штогод каля 10 новых відаў прадукцыі ўкараняецца ў вытворчасць і з поспехам рэалізуецца праз шырокую гандлёвую сетку, заваёўваючы ўсё большае кола пакупнікоў. Так было ў мінулым годзе, калі з канвеера завода сышлі новыя ўзоры марожанага, глазураваных сыркоў з арэхам і какосам, маслянка, масла сметанковае салёнае і шэраг іншых прадуктаў. Сёлета ўжо таксама зроблены пачын у распрацоўцы і ўкараненні ў масавую вытворчасць навінак. Асноўныя намаганні спецыялістаў тэхналагічнага аддзела накіраваны на выпуск прадукцыі дыетычнага і лячэбна-прафілактычнага накірункаў.

І, увага, патэнцыяльныя пакупнікі! У стадыі завяршэння работы па выпуску баранавіцкай смятаны і кефіру з кальцыем! Агульнавядома, што большасць людзей, у тым ліку і маладых, адчуваюць недахоп кальцыю, з-за чаго, як правіла, развіваецца на зубах карыес, а косці не валодаюць неабходнай трываласцю. Увесь недахоп неабходных карысных рэчываў можна будзе кампенсаваць, ужываючы малочныя прадукты з таварным знакам «Раніца»!

На прадпрыемстве ўпэўненыя, што любыя запатрабаванні пакупнікоў могуць быць задаволены ў самы кароткі час, бо вытворчыя працэсы на ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» вызначаюцца значнай гібкасцю, каб аператыўна рэагаваць на змяненні рынку. Адсочваць попыт на малочныя прадукты дапамагаюць не толькі гандлёвыя кропкі і дэгустацыйныя выставы, якія праводзяцца ў многіх рэгіёнах рэспублікі, але ў першую чаргу свой фірменны гандаль. Праўда, пакуль шырокай гандлёвай сеткай на заводзе пахваліцца не могуць, бо абсалютная большасць уласных сродкаў ідзе на інвеставанне праграм па мадэрнізацыі вытворчасці, замену абсталявання і асваенне перадавых тэхналогій. Тым не менш прынцып адваротнай сувязі вытворца — гандлёвая сетка — пакупнік — вытворца працуе аператыўна і надзейна.

Зрэшты, менавіта такая сістэма сувязі падказвае, што найбольш эфектыўна было б развіваць некалькі накірункаў дзейнасці, а не выпускаць сотню ці больш найменняў. Падзяліць бы ў тым жа Брэсцкім рэгіёне сярод вытворцаў свае накірункі: адзін выпускае сыры, другі — малако і смятану, трэці — кефір і тварог, чацвёрты — ёгурты і г.д. Можна было б зэканоміць не толькі на дарожных расходах, але і максімальна аптымізаваць вытворчасць з мінімізацыяй затрат. Праўда, пакуль такія разважанні кіраўнікоў-эканамістаў з разраду віртуальных. Хоць, хто ведае, можа гэты закон бізнэсу запрацуе ў малочнай галіне краіны ці асобна ўзятым рэгіёне ў бліжэйшым будучым.

1


2


3


4


5


## ДЗЕНЬ ЗАЎТРАШНІ

Ці запрацуе эканамічны закон захавання і развіцця вытворчасці пры найменшых затратах — пакажа час. Між тым на ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» ужо сёння глядзяць у заўтрашні дзень, як кажуць, у поўнай баявой гатоўнасці. Тут укладваюць — і будуць гэта рабіць надалей — уласныя інвестыцыі ў тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці, дзякуючы чаму стане магчымай больш глыбінная перапрацоўка малака, што дазволіць яшчэ больш палепшыць якасць прадукцыі і пашырыць яе асартымент, захоўваючы лепшыя традыцыі вытворчасці.

Адным з самых затратных яе артыкулаў з'яўляецца спажыванне электраэнергіі і цяпла. Таму ўвесь мінулы год і пачатак гэтага быў прысвечаны ўкладанню інвестыцый у энергазберагальныя тэхналогіі. Раней цяпло набывалася ў суседзяў. Цяпер крыніца цяпла максімальна прыбліжана да ўсіх вытворчых аб'ектаў. У дадатак да ўсяго на прадпрыемстве пабудавана ўласная кацельня, заменены цеплавыя трасы.

Наяўнасць сучаснай крыніцы цяпла — гэта змяншэнне затрат і на самай энергаёмістай лініі вытворчасці — па выпуску сухога малака, якое, дарэчы, з'яўляецца даволі значнай экспартнай пазіцыяй.

Дырэктар ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» з задавальненнем адзначае, што з увядзеннем газагенератара ў строй спажыванне газу зменшылася даволі істотна, а вытворчасць сухога абястлушчанага малака ўзрасла на 20 працэнтаў. Вось такая простая арыфметыка ў эканоміі!

Акрамя энергетычнай і цеплавой тэмаў на бліжэйшую перспектыву на слыху і тэма новых распрацовак з выкарыстаннем у асноўным натуральных кампанентаў з улікам клопатаў аб здароўі кожнага спажыўца.

***У бліжэйшых планах на 2007 год — укараненне ў вытворчасць сістэмы забеспячэння экалагічнай бяспекі ISO 14000, аховы працы ISO 18000 і бяспекі прадуктаў ISO 22000.***

## МАРКЕТЫНГ ЯК ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

***Ролю службы маркетынгу сёння нельга недаацэньваць. З гэтым не паспрачаешся. Асабліва калі пералічыць задачы, якія стаяць перад гэтым падраздзяленнем ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат». Асноўныя з іх:***

- павышэнне якасці прадукцыі і яе канкурэнтаздольнасці;
- пазіцыянаванне выпрацоўваемай прадукцыі;
- стварэнне аптымальнага асартыменту для задавальнення запытаў спажыўцоў, аптымізацыя фінансавых вынікаў прадпрыемства;
- падаўжэнне тэрміну захоўвання прадукцыі;
- распрацоўка прыгожага дызайну ўпакоўкі і яго разнавіднасцяў;
- фарміраванне цаны, улічваючы знешнія і ўнутраныя цэнаўтваральныя фактары;
- фарміраванне і стымуляванне попыту на прадукцыю, інфармаванне пакупнікоў аб уласцівасцях і вартасці прадукцыі.

Апошнія маркетынгавыя даследаванні паказваюць, што на рынку айчынных малочных прадуктаў адбываюцца якасныя змяненні, у свядомасці спажыўцоў фарміруецца меркаванне аб лепшай якасці беларускай прадукцыі ў параўнанні з малочнай прадукцыяй прадпрыемстваў-канкурэнтаў расійскага рынку. Усё больш запатрабаванай становіцца прадукцыя лячэбна-прафілактычнага і дыетычнага накірункаў. Намаганні спецыялістаў будуць накіраваны на выпуск шырокага асартыменту паўнацэнных прадуктаў, якія адпавядалі б стандартам збалансаванага харчавання для розных узроставых груп насельніцтва з улікам іх здароўя, умоў жыцця і роду прафесійнай дзейнасці. Улічваючы экалагічную абстаноўку, якая пагаршаецца, і павышаную ўвагу чалавека і медыцыны да якасці харчавання, актуальным з'яўляецца выпуск прадуктаў лячэбна-прафілактычнага прызначэння.

***Маркетынгавыя даследаванні паказваюць, што прадукцыя Баранавіцкага малочнага камбіната задавальняе самых запатрабавальных пакупнікоў.***

**ТРАДЫЦЫІ ПРАДПРЫЕМСТВА — ВЫСОКА ЦАНІЦЬ ДЗЕЛАВЫЯ КАНТАКТЫ.**

**Запрашаем зацікаўленыя бакі да цеснага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва!**

**Для падтрымання канкурэнтных пазіцый на знешнім рынку ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» забяспечвае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, пашырае асартымент канкурэнтаздольнай прадукцыі, праводзіць вывучэнне і маніторынг рынку, асаблівую ўвагу надае камп'ютарным і сеткавым тэхналогіям, якія адыгрываюць значную ролю ў дзейнасці прадпрыемства.**

6


7


8


9



***Прадукцыя ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» шырока вядома не толькі на ўнутраным рынку, але і на знешнім. На прадпрыемстве штогод адзначаецца павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі экспартнай прадукцыі.***

У 2006 годзе нямала прадукцыі было пастаўлена на экспарт. Стабільны і нават павышаны попыт за мяжой маюць:

- сухое абястлушчанае малако;
- сметанковае масла;
- малако канцэнтраванае;
- казеін;
- неразведзенае сухое малако.

Межы паставак выпрацоўваемай прадукцыі штогод пашыраюцца. Напрыклад, зараз плануецца павелічэнне ўдзельнай вагі рэалізацыі сухога абястлушчанага малака за кошт кампаній, якія знаходзяцца ў Сінгапуры, Галандыі, Японіі, Польшчы, Егіпце. Рост паставак казеіну звязаны з фірмамі, якія працуюць у Польшчы і ЗША.

Важна таксама адзначыць, што пашырэнне рынкаў збыту, а гэта значыць, павелічэнне прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі, нацэлена і на расійскі спажывецкі рынак, традыцыйна даволі ёмісты.

У 2008 годзе мяркуецца вывад на рынак блізкага і далёкага замежжа новай прадукцыі — цвёрдых сыроў.

***ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» захаваў лепшыя традыцыі натуральнасці. Яго таварны знак «Раніца» — гэта сінонім і класічных рэцэптур натуральнамалочных прадуктаў, і палепшаных варыянтаў вечных малочных тэмаў: апетытных, адмысловых навінак. Самы патрабавальны пакупнік знойдзе ў «Раніцы» тое, што яму неабходна.***

**ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» — гэта:**

- шырокі асартымент выпускаемай прадукцыі;
- багаты выбар карысных для здароўя прадуктаў;
- прывабная ўпакоўка, якая падаўжае тэрмін захоўвання тавару;
- даступныя цэны;
- зручныя формы работы.

### НАШЫ РЭКВІЗІТЫ:

**225352,
Рэспубліка Беларусь,
Брэсцкая вобласць,
г. Баранавічы,
вул. 50 гадоў БССР, 51,
ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат».
Тэл: +375-163-42-58-59,
+375-163-42-58-58.**

Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

УТВЕРЖДЕНО
Правлением АСБ «Беларусбанк»
21 мая 2007 г.
Протокол № 50

# УСЛОВИЯ
## договора срочного банковского вклада в белорусских рублях «Юбиляр»

1. Вкладополучатель обязуется:

1.1. обеспечить сохранность вклада, своевременность исполнения своих обязательств по договору срочного банковского вклада в белорусских рублях «Юбиляр» (далее по тексту – договор) и банковскую тайну Вкладчика;

1.2. возвратить вклад или его часть в структурном подразделении Вкладополучателя, в котором ведется вкладной счет по договору, или в ином месте, определяемом Вкладополучателем:

1.2.1. в день наступления срока возврата вклада – по первому требованию Вкладчика;

1.2.2. при истребовании вклада или его части в период до наступления срока возврата вклада и при хранении вклада в соответствии с п. 5.4. настоящих Условий – в течение пяти дней со дня предъявления соответствующего требования Вкладчиком;

1.3. оказывать услуги по вкладу, установленные Вкладополучателем;

1.4. в случае неисполнения, ненадлежащего исполнения своих обязательств по возврату вклада, выплате дохода по вкладу или при расторжении договора по требованию Вкладчика вследствие ненадлежащего исполнения или неисполнения Вкладополучателем своих обязательств по договору – возвратить вклад; выплатить основной доход (без понижения его размера при совершении расходной операции в соответствии с п. 5.3. настоящих Условий), дополнительный доход по вкладу в соответствии с договором и уплатить штраф, предусмотренный настоящими Условиями, – по первому требованию Вкладчика.

2. Вкладчик обязуется:

2.1. оплачивать услуги, оказываемые Вкладополучателем, в соответствии с п. 1.3. настоящих Условий, в размере, определенном Вкладополучателем, в момент оказания соответствующей услуги.

3. Вкладополучатель имеет право:

3.1. при неисполнении Вкладчиком п. 2.1. настоящих Условий не оказывать Вкладчику услуги по вкладу.

4. Вкладчик имеет право:

4.1. в любой момент расторгнуть настоящий Договор по основаниям, предусмотренным законодательством Республики Беларусь, в том числе в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения Вкладополучателем своих обязательств.

5. Порядок совершения операций по вкладу.

5.1. При начислении основного и дополнительного дохода по вкладу количество дней в году принимается точное (365 или 366 в високосном году). Основной и дополнительный доход по вкладу начисляется за каждый календарный день года исходя из фактического остатка суммы вклада.

5.1.1. Совершение расходной операции в период со дня истечения 1-ого (Одного) месяца со дня заключения договора, не влечет перерасчета основного дохода по пониженной процентной ставке. При этом начисление и выплата дополнительного дохода не производится.

5.2. Если иное не предусмотрено настоящими Условиями, до дня наступления срока возврата вклада основной доход выплачивается путем присоединения к остатку вклада в день истечения каждого месяца хранения вклада, начиная со дня заключения договора.

Выплата основного дохода путем присоединения к остатку вклада производится также:

— в день совершения расходной операции в соответствии с п. 5.3. настоящих Условий;

— в день наступления срока возврата вклада;

— в день закрытия вкладного счета;

— в срок, указанный в п. 5.4. настоящих Условий;

— в период со дня истечения 1-ого (Одного) месяца со дня заключения договора, в день совершения расходной операции наследником (иным правопреемником) Вкладчика.

Дополнительный доход выплачивается путем присоединения к остатку вклада в день наступления срока возврата вклада, при условии, что до дня наступления срока возврата по вкладу не совершалась ни одна расходная операция.

5.3. При совершении расходной операции Вкладчиком, его наследником либо иным лицом, имеющим право совершать расходные операции по вкладу (по исполнительным документам, по доверенности и т.п.) по вкладу, в период до истечения 1-ого (Одного) месяца со дня заключения договора, за период со дня заключения договора до дня совершения указанной расходной операции производится перерасчет основного дохода по пониженной процентной ставке, из расчета размера процентной ставки, действующей по вкладу до востребования в белорусских рублях для физических лиц (с учетом ее изменения за фактический срок хранения вклада) для физических лиц.

Вкладополучатель определяет разницу между фактически выплаченным Вкладчику доходом и начисленным по пониженной процентной ставке.

Если выплаченный доход превышает сумму начисленных процентов по пониженной процентной ставке, Вкладополучатель производит зачет встречных однородных требований и совершает расходную операцию после уменьшения остатка вклада на сумму образовавшейся разницы.

5.4. Начиная со дня, когда в соответствии с п. 5.3. настоящих Условий истребуется только часть вклада; со дня совершения первой расходной операции наследником (иным правопреемником) Вкладчика в период со дня истечения 1-ого (Одного) месяца со дня заключения договора; а также со дня наступления срока возврата вклада, вклад (остаток вклада) хранится с начислением основного дохода в размере процентной ставки, действующей по вкладу до востребования в белорусских рублях для физических лиц с учетом изменения ее размера за фактический срок хранения вклада (остатка вклада). Сумма начисленного основного дохода выплачивается путем присоединения к вкладу (остатку вклада) в последний день года. Приходные операции по вкладу (кроме присоединения процентов) не производятся.

5.5. При заключении договора с РУП «Белпочта» от имени Вкладополучателя – срок вклада исчисляется, начисление процентов осуществляется со дня передачи физическим лицом наличных денежных средств РУП «Белпочта». С момента передачи физическим лицом наличных денежных средств РУП «Белпочта» все обязательства перед Вкладчиком, вытекающие из договора банковского вклада, несет Вкладополучатель.

6. Прочие условия.

6.1. За день истечения сроков, указанных в п. 5.1.1., п. 5.2., первой части п.5.3., п. 5.4., настоящих Условий, принимается день, который по названию своего числа месяца является таким же, что и название числа месяца дня заключения договора. Если день истечения вышеуказанных сроков приходится на месяц, в котором нет соответствующего числа, то днем истечения срока является последний день такого месяца.

6.2. Вкладополучатель, в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения своих обязательств по возврату вклада, выплате дохода по вкладу, обязуется уплатить Вкладчику штраф в размере одной базовой величины на день выплаты, определенной в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

6.3. Вкладополучатель несет ответственность, установленную законодательством Республики Беларусь, за привлечение вкладов (депозитов) без лицензии либо в период отзыва лицензии.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

Эксклюзіў

**У гэтым памяшканні са сценамі больш чым метровай таўшчыні і велізарнымі бранiраванымі дзвярамі на ўваходзе ў савецкія часы захоўвалі наяўныя грошы — папяровыя і разменную манету — на ўсю Беларусь. Колькі іх там умяшчалася, большасць з нас, напэўна, ніколі ведаць не будзе, але, мяркуючы па плошчы толькі адной падлогі (103 квадратныя метры), гаворка можа весціся пра вельмі вялікія сумы. Пасля будаўніцтва новага суперсучаснага сховішча колішняя «камора-сейф» была перададзена і прыстасавана пад патрэбы музея Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. На сёння гэта адзіная ў краіне выставачная зала з падобнай ступенню абароненасці, якая дазваляе экспанаваць не толькі папяровыя грошы і манеты, але і нумізматычныя комплексы і каштоўныя металы: серабро, золата, плаціну. Зрэшты, гэта не адзінае ноў-хау, не апошняя адметнасць, без перабольшання, унікальнага музея.**




# «КАМУ СУСТРЭНЕЦЦА ЗАГАДКАВАЯ ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА, АТРЫМАЕ ДАР — БАЧЫЦЬ УСЕ СХАВАНЫЯ Ў ЗЯМЛІ СКАРБЫ...»

## Рэпартаж з музея Нацыянальнага банка

...Трапіць у яго не так проста. І не таму, што музей па сутнасці з'яўляецца закрытай установай: па папярэдніх заяўках тут прымаюць невялікія групы з устаноў, арганізацый, яго наведваюць шматлікія афіцыйныя дэлегацыі, якія прыбываюць у нашу краіну. Наадварот, папулярнасці (пры поўнай адсутнасці якой-небудзь рэкламы, якую замяняе «народнае радыё») у наведвальнікаў новай экспазіцыі можа пазайздросціць любая іншая музейная ўстанова. Напрыклад, студэнты самастойна, без выкладчыкаў, напрыканцы навучальнага года і напярэдадні сесіі (!) фарміруюць групы і перадаюць у службу бяспекі Нацыянальнага банка спісы на атрыманне пропускаў у музей. Але, дзякуючы добраму стаўленню да «Звязды» яго дырэктара Ірыны Масько, ў шчыльным графіку наведванняў вольная хвіліна аператыўна знайшлася і для журналістаў газеты.

— Згодна са старажытнай беларускай легендай, толькі раз у год, у ноч на Івана Купалу, цвіце папараць. І той, хто ўбачыць загадкавую кветку, атрымае магчымасць убачыць усе скарбы, схаваныя ў зямлі. Гэта народнае паданне лягло ў аснову мастацкай канцэпцыі экспазіцыі «Гісторыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі», — перш чым адчыніць перад намі браніраваныя дзверы ў «камору-сейф», інтрыгуе нас Ірына Францаўна. — Асноўную задачу праекта можна сфармуляваць так: на аснове музейнага фонду, які ёсць у Нацыянальным банку, а таксама дакументаў і рэканструкцый адлюстраваць музейнымі сродкамі гісторыю грашовага абарачэння на тэрыторыі краіны са старажытных часоў да нашых дзён — усяго, што датычыцца гісторыі выкарыстання манет і каштоўных металаў. Наведвальнікі павінны нібыта трапіць у казку...

...У цэнтры прасторнай залы загадкава-таямніча зіхацяць ліхтары, асвятляючы стылізаваную пад кветкі папараці калону — быццам бы яны ўзніклі перад намі ўначы. І, цуд, пасля гэтага відовішча ты атрымліваеш магчымасць бачыць схаваныя скарбы: па ходу гадзіннікавай стрэлкі адзін за адным пачынаюць успыхваць таямнічым жа святлом серабра і золата сектары экспазіцыі. Ты ідзеш за гэтым прыцягальным пуцяводным ззяннем, адкрываючы для сябе ўсё новыя каштоўнасці, і «ноч» у зале пакрысе адступае. Атрыманы «дар» пераносіць цябе не толькі ад скарбу да скарбу, але і з адной эпохі ў другую. Вось першыя манеты на тэрыторыі Беларусі, у асноўным сярэбраныя дэнарыі рымскіх правінцый I—III стагоддзяў. Іх з'яўленне — адгалосак «бурштынавага шляху», на той час ва ўсходне-еўрапейскіх плямёнаў яшчэ не было сур'ёзнай патрэбы ў грашах... У перыяд феадальнай раздробленасці XII—пачатку XIV стагоддзя пераважна вялася натуральная гаспадарка, але для асабліва буйных плацяжоў выкарыстоўвалі сярэбраныя зліткі пэўнай масы і формы. На тэрыторыі тагачаснай Беларусі існавалі тры разнавіднасці зліткаў-грыўнаў: «літоўскія», «кіеўскія» і «ноўгарадскія». Усе яны былі знойдзены ў адзіным скарбе такога кшталту — Вішчанскім (Вішчанскі скарб знаходзіцца ў кабінеце нумізматыкі БДУ) — а муляжы прадстаўлены ў экспазіцыі... У музеі захоўваецца буйнейшы ва Усходняй Еўропе нумізматычны комплекс пражскіх грошаў: больш за 6 тысяч манет!




Можна ўбачыць і буйнейшы са знойдзеных на тэрыторыі нашай краіны нумізматычны комплекс з рускімі капейкамі, сярод якіх ёсць вельмі рэдкая манета — літоўскі паўтарак 1652 года. Ва ўсім свеце захавалася не больш за сем такіх манет, прычым, наша — у найлепшай ступені захаванасці... У экспазіцыі можна азнаёміцца са скураным кашальком і 127 манетамі Залатой Арды канца XIV—пачатку XV стагоддзя — даволі рэдкімі для нашай тэрыторыі... Прадстаўлена тут і першая медная манета ў грашовым абарачэнні Беларусі — торнер (двайны пені) Шатландыі, выпушчаны ў абарачэнне ў 1632—1633 гадах. Адлюстраванне кветкі чартапалоху з лацінскай легендай — ніхто не дакранецца да мяне беспакарана — рыса, якая адрознівае гэту прыгожую манету...

— Усяго фонды музея налічваюць звыш 22 тысяч прадметаў, — тлумачыць Ірына Масько, пакуль мы знаёмімся з экспазіцыяй. — Гэта дазволіла сфарміраваць па-сапраўднаму прафесійны музейны фонд, рыхтаваць змястоўныя, цікавыя выстаўкі з прыцягненнем высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Дастаткова будзе сказаць, што над канцэпцыяй экспазіцыі «Гісторыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі» працавалі пяць (!) мастацкіх майстэрняў. Напрыклад, упершыню ў музейнай практыцы краіны былі выкарыстаны аб'ёмныя, са стэрэаэфектам (!) заднія планы для экспазіцыі нумізматычных комплексаў. Копіі старажытных гравюр былі надрукаваны на палатне. На высокім узроўні былі выкананы муляжы, гістарычныя рэканструкцыі. Зразумела, што такі сур'ёзны падыход як да канкрэтнай экспазіцыі, так і да музея ў цэлым стаў магчымым найперш дзякуючы стаўленню да справы кіраўніцтва Нацыянальнага банка, літаральна кожнага яго супрацоўніка. Усё гэта дазволіла стварыць не ўнутрыведамасны, карпаратыўны музей, а экспазіцыю, якой можа ганарыцца дзяржава. Так, менавіта дзяржава, паколькі Нацыянальны банк у тым ліку напаўняе яе палітыку канкрэтным зместам па захаванню навакольнага асяроддзя, гісторыка-культурнай спадчыны. Як? Ды праз выпуск беларускіх плацежных сродкаў: банкнот і памятных манет, якія з'яўляюцца своеасаблівай візітоўкай краіны, нясуць вельмі важную, ёмкую інфармацыю аб дзяржаве, што іх выпускае.

— Ва ўсім свеце інтарэс да нашых памятных манет толькі павялічваецца, — гаворыць дырэктар музея. — Напрыклад, манеты з серыі «Казкі народаў свету» тыражамі 20 тысяч адзінак разыходзяцца амаль імгненна. Сапраўдны «шлягер» апошняга часу, які выклікаў вялікую цікаўнасць сярод нумізматаў, — вельмі прыгожая серыя памятных манет «Святы і абрады беларусаў». А ўвогуле ў экспазіцыі наведвальнікі могуць азнаёміцца з поўнай калекцыяй беларускіх памятных манет, выпушчаных у перыяд з 1996 года па сёння.

...Завяршаем агляд каля той самай цэнтральнай калоны, што сімвалізуе кветкі папараці. Тут пад шклом размешчаны апошні комплекс экспанатаў — мерныя зліткі з абрэвіятурай Нацыянальнага банка, выкананыя ў серабры, золаце, плаціне. Не сакрэт, што сёння ў краіне створаны і паспяхова развіваецца рынак каштоўных металаў, чаму ў немалой ступені садзейнічалі і намаганні галоўнага банка Беларусі. Скарбы нашай дзяржавы апошні раз яскрава ўспыхнулі перад намі. Агляд — «летняя купальская ноч» — наблізіўся да свайго завяршэння. Казка скончылася і мы накіроўваемся да выхаду. І раптам, як апошні падарунак на развітанне — карта скарбаў з сакрэтам. Складзеная на падставе даследаванняў вядомага беларускага навукоўца прафесара Валянціна Рабцэвіча і выкананая з варыяэфектам, яна ўтрымлівае ўсе вядомыя месцы ў Беларусі, дзе ў розныя часы былі знойдзены рэальныя нумізматычныя комплексы. Але гэтая тайна можа адкрыцца толькі ў выпадку, калі глядзець на карту пад пэўным вуглом. Але ж для тых, хто бачыў папараць-кветку, нічога немагчымага не існуе, ці не так?!

**P.S**. У матэрыяле зашыфраваны «код скарба». Хто здолее адшукаць яго, зможа паспрабаваць трапіць на экскурсію ў музей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# Архіў раскрывае новыя старонкі гісторыі

***Нацыянальны архіў Беларусі ў дні святкавання свайго 80-годдзя прэзентаваў пяць новых кніг. Кожная з іх дазваляе лепш зразумець дзень сённяшні, які прыйшоў на змену дню ўчарашняму.***

У нашай нават зусім нядаўняй гісторыі шмат загадкавага і таямнічага. І суджэнняў пра яе, нашу гісторыю, дастаткова супярэчлівых і процілеглых. Апошнія 12 гадоў архівісты Беларусі робяць вялізную працу па развенчванню гістарычных міфаў і домыслаў. Яны адкрылі дзверы архіваў для даследчыкаў, супрацоўнічаюць з калегамі з іншых дзяржаў і ў вялікай колькасці ўво-дзяць у навуковае карыстанне раней невядомыя дакументы. З 1995 па 2007 год архівам выдадзена больш за 100 кніг, якія дапамагаюць лепш зразумець, што на самай справе адбывалася ў тыя ці іншыя моманты нашага нядаўняга мінулага.

Дзякуючы супрацоўніцтву Нацыянальнага архіва з Расійскім дзяржаўным ваенным архівам на свет з'явіўся зборнік **«Напярэдадні. Заходняя асобая ваенная акруга (канец 1939 г. — 1941 г.). Дакументы і матэрыялы».**

— Час, які папярэднічаў вайне, вывучаны мала, — прадставіў кнігу намеснік дырэктара Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва Вадзім Варанцоў. — Час гэты не проста цікавы, ён надзвычай важны, бо тлумачыць тое, што адбылося ў 1941, 1942 і 1943 гадах...

Не толькі дакументальнай, але і аналітычнай атрымалася кніга **«Аўстрыйцы і судэцкія немцы перад савецкімі ваеннымі трыбуналамі ў Беларусі. 1945—1950 гг.»**, выдадзеная на нямецкай і рускай мовах пад рэдакцыяй С. Карнера і В. Селяменева.

— Гэта навуковы зборнік, які змяшчае 12 артыкулаў аўстрыйскіх і беларускіх гісторыкаў, — расказаў намеснік дырэктара Інстытута імя Людвіга Больцмана па даследаванню наступстваў войнаў (Аўстрыя) спадар Харальд Кноль. — Упершыню Нацыянальны архіў даў нам магчымасць атрымаць доступ да крымінальных спраў, якія праводзіліся над удзельнікамі нямецкага вермахта падчас Другой сусветнай вайны, а таксама над судэцкімі немцамі (нямецкае насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі сённяшніх Чэхіі і Славакіі) і грамадзянскім насельніцтвам Аўстрыі ў пасляваенны перыяд.

Трэцяя кніга выдадзена накладам усяго ў 50 экзэмпляраў. Людзям, якія не працавалі ў архіве, назва яе будзе малазразумелай: **«Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. 1918—1941гг. Фонд 4п. Вопіс 1».** Затое гісторыкі і архівісты ўжо назвалі яе бясцэннай.

Яшчэ адно выданне прысвечана гісторыі архіўнай справы на Беларусі. На яе вокладцы так і напісана: **«Наша гісторыя. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь». 1927—2007 гг.»**

Пятая кніга — таксама плён сумеснай працы: дырэктара Нацыянальнага архіва Вячаслава Селяменева і журналіста Віктара Шымоліна. Яна прысвечана аперацыі па знішчэнню стаўленіка Гітлера ў Беларусі, генеральнага камісара Вільгельма Кубэ — **«Паляванне на ка́та».**

— Ідэя кнігі ўзнікла з-за разыходжанняў паміж паказаннямі сведкаў гэтай знакамітай аперацыі, арганізаванай мінскім падполлем, і дакументамі, — расказаў карэспандэнту «Звязды» Віктар Шымолін. — У ёй з'яўляюцца новыя ўдзельнікі, пра якіх раней не было вядома, а таксама, дзякуючы новым дакументам, упершыню даволі дакладна вымаляваўся антураж, у якім праходзіла аперацыя. Кніга развейвае многія тайны, праўда, не ўсе, і домыслы, звязаныя з забойствам Кубэ.

Такім чынам архіў годна адзначае свой юбілей, і канешне, рыхтуе да выдання новыя кнігі.

— У нас планы працягнуць супрацоўніцтва з Расійскім дзяржаўным ваенным архівам і падрыхтаваць да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР зборнік дакументаў па гэтай тэме, уключыць сюды дакументы з архіва палітычнай гісторыі Расіі, з нашага архіва і з ваеннага, — сказаў Вячаслаў Селяменеў. — Мы рыхтуем публікацыю таксама да юбілею Якуба Коласа і Янкі Купалы. Архіўная справа патрэбна людзям, грамадству. Праўду, хай яна і горкая, трэба ведаць, каб не паўтараць сумнага вопыту, вучыцца на памылках. Я за тое, каб архіўныя дакументы былі даступныя даследчыкам, і наш архіў усё робіць для гэтага. Сёння на сакрэтным захаванні засталося менш за адзнага працэнта дакументаў. Гэта значыць, што ў архіў можа прыйсці любы чалавек і працаваць там.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.53 | 21.21 | 16.28 |
| Віцебск — | 4.35 | 21.18 | 16.43 |
| Магілёў — | 4.43 | 21.11 | 16.28 |
| Гомель — | 4.48 | 20.59 | 16.11 |
| Гродна — | 5.10 | 21.35 | 16.25 |
| Брэст — | 5.18 | 21.27 | 16.09 |

**Імяніны**

***Пр.*** *Германа, Дзяніса, Пятра*
***К.*** *Віялеты, Магды, Барыса, Лявона, Рыгора, Урбана*

**Месяц**

***Першая квадра***
***Месяц у сузор'і Дзевы***

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

**ВАРШАВА** +29 — +31 °C Без ападкаў
**МАСКВА** +27 — +29 °C Без ападкаў
**ВІЛЬНЮС** +26 — +28 °C Без ападкаў
**РЫГА** +24 — +26 °C
**КІЕЎ** +25 — +27 °C Без ападкаў
**С-ПЕЦЯРБУРГ** +23 — +25 °C

## 25 мая

*Дзве даты*

**5493 год** — александрыйская храналогія лічыла гэтую дату днём стварэння свету.

**1917 год** — у Ялце пасля працяглай хваробы памёр Максім Багдановіч.



*Цытата дня:*

***«Непрыемнасці — гэта яшчэ не самае кепскае з таго, што з намі можа здарыцца. Горш за ўсё, калі з намі нічога не здараецца».***

**Рычард Бах.**

**ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ ОАО «ЧЕРВЕНСКИЙ МОЛОЧНЫЙ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩЕГО ИМУЩЕСТВА:**

| № лота | Наименование | Начальные цены с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | ГАЗ 3110 «Волга» 1999 года выпуска | 5 500 000 |
| 2 | Кормоуборочный комбайн Ягуар-840 производство Германии 1999 года выпуска | 159 000 000 |
| 3 | Автопогрузчик 1985 года выпуска | 7 100 000 |
| 4 | Электропогрузчик 1988 года выпуска | 4 500 000 |
| 5 | Станок деревообрабатывающий ЦА-2А | 3 200 000 |
| 6 | Станок деревообрабатывающий универсальный КСМ-1А | 4 700 000 |
| 7 | Станок токарный 1969 года выпуска | 8 800 000 |
| 8 | Станок токарный 16Д25, 1992 года выпуска | 23 000 000 |
| 9 | Станок фрезерный 676, 1993 года выпуска | 5 100 000 |
| 10 | УАЗ 3303, 1992 года выпуска | 2 200 000 |

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня проведения аукциона. Оплата за лот производится в течение 30 дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26.06.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.06.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, 80296207796.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

**ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «МИНСКИЙ АВТОМОБИЛЬНЫЙ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже основного технологического оборудования, находящегося в республиканской собственности — машина листогибочная модель ИВ-2424А, 1991/1992 года выпуска. Начальная цена лота — 29 644 830 рублей. Перечень документов для участия в аукционе, порядок проведения торгов и иные условия оговорены в условиях проведения аукциона. Оплата за приобретенное оборудование производится в соответствии с договором купли-продажи, который заключается в течение 20 рабочих дней после проведения аукциона. Задаток в размере 2 964 483 рубля перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 КУП «Минский городской центр недвижимости». Аукцион состоится 14 июня 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Социалистическая, 2. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 13 июня 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: 227-40-22, 217-96-37.**
**Интернет: www.mgcn.by**

## Усміхнёмся!

Паломнікі з усёй краіны двойчы ў год сыходзяцца ў медкамісію ваенкамата № 35 — кожную вясну тут адбываецца цуд масавага выздараўлення.

☺

**Са шлюбнай аб'явы: «Сімпатычная жанчына без шкодных звычак: не п'е, не курыць, не гуляе, не працуе».**

☺

Медсястра раніцай уваходзіць у палату. Адзін з хворых:

— А вы сёння ўсталі не з таго боку ложка!

— Чаму вы так думаеце?

— А ў вас на нагах тапачкі хірурга.

Згубленае пасведчанне інваліда серыі 09 № 097623 на імя **МЯДЗВЕДЗЕВАЙ Тамары Пятроўны** лічыць несапраўдным.

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю былога галоўнага бухгалтара газеты БАРЫСАВАЙ Людмілы Аляксееўны і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.693. Індэкс 63850. Зак. № 2817. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12